

АНТЫБІЁТЫКІ: ЗА І СУПРАЦЬ 8

ШЧЫРАЯ РАЗМОВА ПРА БАЦЬКОЎСКІЯ СТРАХІ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2018 г. СЕРАДА № 185 (28801)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**1 353 чалавекі**

*працуюць сёння на Беларускай АЭС, з іх каля 900 — аператыўны персанал першага энергаблока. Дарэчы, першы блок укамплектаваны кадрамі практычна цалкам, другі — на 50 %. Аператыўны персанал на другі блок будзе цалкам набраны ў 2019 годзе, рамонтны персанал будзе дадавацца. На першым энергаблоку падрыхтавана восем змен аператыўнага персаналу блокавага пульта кіравання. Да канца кастрычніка яны павінны здаць заключныя экзамены па адпрацоўцы дзеянняў у змене. Гэты персанал абавязаны атрымаць дазвол Дзяржатамнагляду на права вядзення работ у галіне выкарыстання атамнай энергіі. Пры запуску блока ў 2019 годзе беларускім спецыялістам будуць дапамагаць прадстаўнікі «Расатама».*

# Яшчэ ўчора было лета...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Проста не верыцца, што гэты здымак, гераінямі якога сталі сястрычкі з вёскі Богіна Браслаўскага раёна пяцігадовая Маша і трохгадовая Насця ЧАЧУКОВІЧЫ, мог быць зроблены ўсяго некалькі дзён таму, напрыканцы мінулага тыдня. А сёння восень ужо дыктуе свае правы. Хоць сіноптыкі абяцаюць, што хутка ў Беларусі круглы год будзе плюсавая тэмпература, аб чым мы і пішам падрабязна на пятай старонцы сённяшняга нумара. Ці спраўдзяцца гэтыя прагнозы? Пажывём — пабачым...**

**КОРАТКА**

- **МАРГ прапануе абмеркаваць праект змяненняў ва ўказ аб ільготах для бізнесу на вёсцы.**
- БелАЗ да канца 2018 года паставіць у Расію беспілотныя кар'ерныя самазвалы.



- **Мінбудархітэктуры прапануе будаваць кватэры з паменшанай плошчай (на 10—15 %) па больш даступных цэнах.**
- Складанатэхнічныя тавары з нязначнымі дэфектамі ў Беларусі можна будзе вярнуць на працягу 30 дзён.
- **Беларускі гіравік Вячаслаў Харанека ўстанавіў 158-ы рэкорд у кар'еры.**
- Сям'я з шасцю дзецьмі ў Смаргонскім раёне ўратавалася з палаючага дома дзякуючы пажарнаму апавяшчальніку.

■ Даслоўна

## «ТОЛЬКІ АГУЛЬНЫМІ НАМАГАННЯМІ МЫ ЗМОЖАМ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ НЯПРОСТЫМ ВЫКЛІКАМ ЧАСУ»



**Традыцыйна ў пачатку кастрычніка адкрываецца восеньская сесія беларускага парламента. Напярэдадні новага заканатворчага сезона старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў інтэрв'ю карэспандэнту БелТА расказаў пра найбольш значныя для сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны законапраекты, падрыхтоўцы слуханняў па інвестыцыях, падзяліўся планамі развіцця міжпарламенцкага супрацоўніцтва.**

***— Уладзімір Паўлавіч, звяртаючыся да парламентарыяў на закрыцці вясенняй сесіі, вы казалі аб сур'ёзнай нарматворчай рабоце, якую трэба будзе правесці для стварэння прынцыпова новага бізнес-клімату. Якія законапраекты для рэалізацыі дэкрэтаў аб развіцці прадпрымальніцтва, лічбавай эканоміі плануецца прыняць у найбліжэйшы час? Як будзе ўдасканальвацца нарматыўная прававая база з улікам пастаўленай Прэзідэнтам задачы па дасягненні ў наступнай пяцігодцы ВУП у $100 млрд?***

— Паляпшэнне ўмоў вядзення бізнесу — аб'ёмная, карпатлівая і комплексная работа, якая закранае шырокі спектр законаў. Большасць з дакументаў, над якімі цяпер працуюць пастаянныя камісіі (а іх сёння больш за 40), так ці інакш накіраваны на вырашэнне гэтай задачы.

На рэалізацыю дэкрэтаў будзе накіравана прыняцце дэпутацкіх заканадаўчых ініцыятыў па пытаннях інвестыцый і прыватызацыі. Гэтыя праекты арыентаваны на забеспячэнне гарантый правы ўласнасці, абарону ад неправамернага ўмяшання ў дзейнасць інвестараў. Упершыню замацоўваецца прынцып незваротнасці прыватызацыі.

СТАР. 3



## НА БОЧЦЫ З ПОРАХАМ

### Як у нашай краіне ўтылізуюць боепрыпасы?

**Колішняя Беларуская ваенная акруга лічылася адной з самых магутных у СССР. Яно і не дзіўна — акруга прыкрывала заходні, найважнейшы стратэгічны напрамак той краіны. І спадчынай той эпохі сталі ў тым ліку і тысячы вагонаў боепрыпасаў, тэрмін прыдатнасці якіх даўно скончыўся. Натуральна, паўстала пытанне — што з імі рабіць? Здавалася, самы лагічны спосаб — выкарыстаць па прызначэнні. Гэта значыць, узарваць на палігонах. Але ў такім выпадку губляюцца два каштоўныя рэсурсы.**

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

# МЫ НЕ ДЗЕЛІМ КРАІНЫ

## Беларусь не робіць выбар паміж Усходам і Захадам

**Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас выступлення на цырымоніі ўручэння даверчых грамат. Прэзідэнт Беларусі прыняў даверчыя граматы паслоў 12 дзяржаў — Аргенціны, Босніі і Герцагавіны, Венгрыі, Індыі, Іарданіі, Ірака, Мексікі, Панамы, Партугаліі, Расіі, Саудаўскай Аравіі, а таксама Судана.**

Кіраўнік дзяржавы павітаў усіх прысутных на гасціннай беларускай зямлі і павіншаваў з пачаткам новага этапу ў дыпламатычнай кар'еры, а таксама з першым афіцыйным рабочым днём у статусе кіраўнікоў місій сваіх дзяржаў у Беларусі.

Беларускі лідар адзначыў, што Беларусь — гэта еўрапейская дзяржава, якая шануе свой суверэнітэт і паслядоўна рэалізуе міралюбную шматвектарную знешнюю палітыку. «Нашы падыходы добра вядомыя. Беларусы адданыя свабодзе і незалежнасці, адзінству і згодзе, стварэнню і прагрэсу», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: пры гэтым Беларусь не робіць выбар паміж Усходам і Захадам, імкнецца выбудоўваць з усімі партнёрамі без выключэнняў раўнапраўныя палітычныя і ўзаемавыгадныя эканамічныя адносіны. Акрамя таго, наша краіна нацэлена на дыялог без ціску і прымусу, падвойных стандартаў і ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, запэўніў Прэзідэнт.

«Як пераканаы працаўнік канфрантацыі і донар бяспекі ў рэгіёне Беларусь выступае за вырашэнне канфліктаў выключна мірным шляхам. Мы настойліва працуем над пашырэннем кола сваіх аднадумцаў. Толькі аб'яднаўшы намаганні ў гэтым кірунку, можна забяспечыць нармальнае, камфортнае суіснаванне дзяржаў і доўгачаканы спакой», — дадаў ён.

Паводле слоў беларускага лідара, менавіта такой логікай і кіраваліся ў нашай краіне, калі прапанавалі пачаць новую шырокую дыскусію па праблеме еўрапейскай і міжнароднай бяспекі. Яна, па аналогіі з Хельсінкскім працэсам, закліканая садзейнічаць вырашэнню назапашаных супярэчнасцяў паміж дзяржавамі на шырокай прасторы Еўра-Атлантыкі і Еўразіі, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатаваў, што ў галіне эканамічных рэформаў Беларусь абрала шлях эвалюцыйных рынанчых пераўтварэнняў, які выключае балючыя шокі для людзей. Дзякуючы сістэмным мерам па спрашчэнні адміністрацыйных працэдур, ліквідацыі залішніх бар'ераў і абмежаванняў удасканальваюцца ўмовы вядзення бізнесу і самарэалізацыі грамадзян.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на той факт, што рыначны пачатак у эканоміцы ў нашай краіне спалучаецца з сацыяльна адказнай палітыкай. Значныя намаганні накіроўваюцца на забеспячэнне занятасці насельніцтва, даступнасці адукацыі, аховы здароўя, сацыяльных гарантый, на павышэнне іх узроўню. «У цэнтры ўвагі дзяржавы — чалавек з яго запытамі, патрэбамі, трывогамі і надзеямі», — дадаў ён.

«Мы ганарымся тым, што ў Беларусі ўлада не адарваная ад народа. Не сумняваюся, што ў перыяд вашай кадэнцыі вы ўбачыце нямала прыкладаў, якія пацвярджаюць мае словы», — заявіў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, Беларусь гатова дзяліцца сваім вопытам пераўтварэнняў у эканамічнай і іншых сферах, адкрыта для запазычання найлепшых замежных напрацовак. Акрамя таго, наша краіна заўсёды будзе адказным, прадказальным і надзейным партнёрам, запэўніў ён.

### Адкрытыя да кожнага

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка традыцыйна сказаў некалькі слоў пра адносіны Беларусі з кожнай з прадстаўленых краін.

Расію беларускі лідар назваў стратэгічным саюзнікам. Ён дадаў, што мы сумесна ствараем годную будучыню для нашых брацкіх народаў, беражом блізкія і зразумелыя нам каштоўнасці, развіваем інтэграцыйныя працэсы ў рамках Саюзнай дзяржавы, ЕАЭС і іншых аб'яднанняў. Акрамя таго, у нас нямала дасягненняў і ў сферы роўнасці правоў грамадзян, эканамічнай інтэграцыі, прасоўванні агульных інтарэсаў на міжнароднай арэне.

«Я вельмі разлічваю на тое, што новы расійскі пасол зробіць усё, што ад яго залежыць, каб прымножыць ужо дасягнутае на гэтым шляху, надаць новы імпульс узаемадзеянню ва ўсіх сферах. Тым больш з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным зусім нядаўна, вам вядома, мы правялі грунтоўныя перагаворы па беларуска-расійскіх адносінах і дасягнулі дамоўленасцяў па ўсіх пытаннях, якія стаяць на парадку дня, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пераканаы, што вы, Міхаіл Віктаравіч (Бабіч. — **«Звязда»**), маюцца для гэтага неабходныя магчымасці і, як мне Прэзідэнт сказаў, найшырэйшыя паўнамоцтвы».

Што датычыцца Венгрыі, то з гэтай краінай у Беларусі ўсталявілася атмасфера даверу і павагі. Па словах кіраўніка дзяржавы, наша краіна высока цэніць падтрымку па пытанні адмены санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі. Акрамя таго, Прэзідэнт падкрэсліў: у Беларусі ёсць жаданне павышаць узровень двухбаковых адносін.

Прэзідэнт адзначыў гатоўнасць да далейшай актывізацыі супрацоўніцтва з Босніяй і Герцагавінай. Аб адносінах з Партугаліяй беларускі лідар сказаў наступнае: «Бачым патэнцыял для нарошчвання ўзаемадзеяння, зацікаўлены ў збалансаваным росце таваразвароту, павелічэнні аб'ёмаў экспарту».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка разлічвае на зацікаўлены падыход пасла Індыі да змястоўнага напаўнення двухбаковага дыялогу. Дамоўленасці, дасягнутыя на вышэйшым узроўні, ствараюць унікальныя магчымасці для рэалізацыі новых сумесных праектаў у розных галінах.

На думку Прэзідэнта, перспектыўным партнёрам для Беларусі з'яўляецца Саудаўская Аравія, паколькі з ёй паспяхова развіваецца супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы, акрамя таго, прыходзіць час заняцца ўзаемавыгадным гандлем і інвестыцыямі.

Беларускі лідар дадаў, што ёсць нядрэнныя магчымасці для паглыблення эканамічных кантактаў з Іракам і Іарданіяй. Беларусь разлічвае на дапамогу паслоў дзелавым колам у наладжванні і пашырэнні сувязяў у прамысловасці, харчовай індустрыі, сельскай гаспадарцы.

«Асаблівыя словы хачу адрасаваць першаму паслу Судана ў Беларусі. Адкрыццё пасольства вашай рэспублікі ў Мінску мы расцэньваем не толькі як важны палітычны жэст, але і як намер суданскага боку сур'ёзна ўзяцца за практычную рэалізацыю дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе майго візіту ў Хартум год таму», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею на захаванне станоўчай дынамікі і практычную аддачу ад дыялогу з Аргенцінай. На яго думку, ужо напрацаваны патэнцыял неабходна накіраваць у патрэбнае рэчышча, больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці рэгіянальных інтэграцыйных аб'яднанняў.

«Лічым важным актывізаваць адносіны з Мексікай. Наколькі мне вядома, перадумовы для нарошчвання супрацоўніцтва ў гандлёвай, інвестыцыйнай і іншых сферах маюцца. Давайце працаваць разам на ўзаемавыгадных умовах», — сказаў Прэзідэнт.

У якасці перспектыўнага партнёра ў рэгіёне разглядаецца Панама.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### У тэму

**Перад пачаткам цырымоніі з журналістамі пагутарыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Міхаіл БАБІЧ.**

Ён адзначыў, што яго прыход не варта называць новым этапам, гэта прадаўжэнне сумеснай работы, якая вялася на працягу многіх гадоў. На думку Міхаіла Бабіча, цяпер перад светам стаяць новыя выклікі, яны таксама стаяць і перад эканомікамі Расіі і Беларусі.

Паводле яго слоў, адбылася планавая ратацыя. «Тая работа, якая была раней праведзена, мы яе ацэньваем станоўча, пра гэта казаў і наш Прэзідэнт, і Аляксандр Рыгоравіч досыць падрабязна. Натуральна, неабходныя навацыі і дынаміка з улікам тых рашэнняў, якія былі прынятыя ў тым ліку і ў Сочы двума Прэзідэнтамі. Безумоўна, усё гэта будзе рэалізавана практычнай дзейнасцю на тым этапе, на якім нам трэба будзе працаваць», — сказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі.

Што датычыцца перагавораў, якія прайшлі ў Сочы, то тут Міхаіл Бабіч нагадаў, што на найбліжэйшай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў у Душанбэ будуць канчаткова ўзгоднены некаторыя дэталі, пасля чаго абвесцяць афіцыйныя вынікі.

«Калі казаць пра тое, што ўжо сёння можна адзначыць, вельмі станоўчыя і годныя вынікі дастаткова інтэнсіўнага перагаворнага працэсу. Нашы партнёры, бясспрэчна, будуць задаволеныя гэтымі вынікамі», — падкрэсліў ён.

Дыпламат заявіў, што настроены зрабіць усё для таго, каб нашы адносіны былі па-сапраўднаму брацкімі, умацоўваліся, каб была паўнавартасная эканамічная інтэграцыя, развіваўся палітычны саюз, а Саюзная дзяржава была напоўнена рэальным зместам.

У завяршэнні ён зноў падкрэсліў: ніякіх завіслых пытанняў па выніках перагавораў у Сочы не засталося, усе яны маюць рашэнне, станоўчае і канструктыўнае.

## Рабочы візіт у Таджыкістан

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 27 верасня накіруецца з рабочым візітам у Рэспубліку Таджыкістан для ўдзелу ў пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Перагаворная частка саміту будзе ўключаць у сябе пасяджэнні кіраўнікоў дзяржаў у вузкім і пашыраным фарматах. Прэзідэнты разгледзяць і прымуць рашэнні як па пытаннях бягучай дзейнасці Садружнасці, так і па развіцці далейшага ўзаемадзеяння ў розных сферах па ключавых кірунках.

Чакаецца таксама, што на палях саміту ў Душанбэ Аляксандр Лукашэнка правядзе шэраг сустрэч і перагавораў з замежнымі лідарамі па парадках дня двухбаковага супрацоўніцтва.

За рамкамі саміту запланаваны двухбаковыя беларуска-таджыкскія мерапрыемствы. Аляксандр Лукашэнка і Эмамалі Рахмон абмяркуюць найбольш актуальныя пытанні ўзаемадзеяння дзвюх краін і пракантралююць ход рэалізацыі ранейшых дамоўленасцяў.

## Выхад у Афрыку

**У той жа дзень Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Віктара Шэймана.**

Віктар Шэйман далажыў беларускаму лідару аб сваім візіце ў Рэспубліку Зімбабвэ. Падчас паездкі прайшлі перагаворы з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвам, старшынёй Рэзервовага банка, а таксама вядучымі міністрамі, якія курыруюць сферы замежных спраў і міжнароднага гандлю, горнай здабычы і развіцця здабыўной галіны, сельскай гаспадаркі, транспарту і развіцця інфраструктуры.

Бакі абмеркавалі сферы для далейшай работы — сельскую гаспадарку, транспарт, лагістыку, электраэнергетычную сферу, будаўніцтва, адукацыю, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, а таксама пастаўкі ў Зімбабвэ беларускай тэхнікі.

Па некаторых кірунках былі дасягнуты пагадненні. Сярод іх — аб стварэнні прадпрыемстваў, прапрацоўцы пытанняў у галіне сумеснага развіцця інфраструктуры, будаўніцтве чыгунак, аўтамабільных дарог, стварэнні лагістычных цэнтраў, а таксама аб рабочай групе па адпаведных кірунках.

Дарэчы, яшчэ бакі падпісалі кантракты на пастаўкі лесанарыхтоўчай, дарожна-будаўнічай і грузавой тэхнікі на суму амаль шэсць дзясяткаў мільёнаў долараў.

Яшчэ на сустрэчы абмеркавалі і перспектыўныя варыянты работы Кіраўніцтва справамі ў нашай краіне — гэта перапрацоўка і вытворчасць сельгаспрадукцыі, сфера інфармацыйных тэхналогій.

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паўночная Карэя прапанавала краінам аб'яднацца супраць санкцый ЗША



Паўночная Карэя прапанавала стварыць міжнародную прававую сістэму для зняцця амерыканскіх санкцый. Такую заяву зрабіў намеснік старшыні Цэнтральнага суда КНДР У Сан Чхоль падчас Міжнароднага юрыдычнага форуму краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна ва Уладзівастоку. «Зняцце санкцый ЗША акажа станоўчы эфект на развіццё краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна і на стабільнасць і мір на Карэйскім паўвостраве», — заўважыў ён. На думку Пхеньяна, неабходна выпрацаваць спосаб процідзейнічаць Злучаным Штатам, каб дасягнуць міжнароднай роўнасці і справядлівасці. «Палітычныя і юрыдычныя арганізацыі павінны заклікаць Вашынгтон адказаць за свае дзеянні і даць незалежную юрыдычную ацэнку яго беззаконню», — адзначыў прадстаўнік КНДР. Ён таксама падкрэсліў, што абмежавальныя меры ЗША — інструмент сілы і маніпуляцый.

### Парламент Швецыі не працягнуў мандат дзеючага прэм'ера па выніках выбараў

Парламент Швецыі не падтрымаў кандыдатуру дзеючага прэм'ер-міністра сацыял-дэмакрата Стэфана Лёвена для фарміравання ўрада краіны па выніках парламенцкіх выбараў. Як паведамляе выданне Local, супраць Лёвена прагаласавалі 204 дэпутаты з 349. Неабходнасць галасавання была выкліканая тым, што ні адна з партый і ні адзін з палітычных блокаў не набралі па выніках мінулых выбараў большасці галасоў, таму на фарміраванне ўрада прэтэндуе і апазіцыя. У тройцы найбуйнейшых у Швецыі партый па выніках праведзеных выбараў на першым месцы — сацыял-дэмакраты (28,3 працэнта), за імі ідуць апазіцыйная ліберальна-кансерватыўная партыя з 19,8 працэнта і «Дэмакраты Швецыі» (17,5 працэнта). Вынікі галасавання ў парламенце азначаюць, што Лёвен узначаліць пераходны ўрад, а двум палітычным блокам Швецыі трэба будзе весці складаныя перамовы пра тое, хто менавіта стане прэм'ерам і якія менавіта партыі будуць супрацоўнічаць адна з адной у парламенце.

### Астраномы знайшлі дзіўную крыніцу святла

Касмічная прастора поўная незвычайных сігналаў і крыніц выпраменьвання, прырода якіх усё яшчэ не ясная астрафізікам. Цяпер жа астраномы выявілі новую незразумелую крыніцу, гэтым разам у інфрачырвоным (цеплавым) дыяпазоне электрамагнітнага выпраменьвання. Выяўлена яна навукоўцамі пры дапамозе касмічнага тэлескопа Hubble ў ваколіцах нейтроннай зоркі, размешчанай у адноснай блізкасці ад Сонца — каля 800 светлавых гадоў. Дзіўнае выпраменьванне было выяўлена групай даследчыкаў з універсітэта штата Пенсільванія (ЗША) у супрацоўніцтве з турэцкімі навукоўцамі. Вывучэнне крыніцы выпраменьвання дапаможа лепш зразумець эвалюцыю нейтронных зорак — надзвычай шчыльных аб'ектаў, якія застаюцца на месцы звышновых выбухаў.

# «ТОЛЬКІ АГУЛЬНЫМІ НАМАГАННЯМІ МЫ ЗМОЖАМ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ НЯПРОСТЫМ ВЫКЛІКАМ ЧАСУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спрашчэнню ўмоў ажыццяўлення транспартнай дзейнасці і грузаперавозак будзе спрыяць унясенне карэктыў у законы «Аб транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці», «Аб аўтамабільных дарогах і дарожнай дзейнасці». У кантэксце вырашэння задач па лічбавізацыі эканомікі дэпутаты плануюць унесці змяненні ў закон «Аб электронным дакуменце і электронным лічбавым подпісе».

У найбліжэйшыя месяцы ў Палату прадстаўнікоў паступіць яшчэ некалькі законапраектаў па пытаннях гаспадарчых таварыстваў, натуральных манаполій, дзяржаўнай інавацыйнай палітыкі і інавацыйнай дзейнасці, аплатных паслуг.

Працягнецца работа і па дэкрыміналізацыі дзеянняў, звязаных з парушэннямі суб'ектамі гаспадарання заканадаўства пры ажыццяўленні эканамічнай дзейнасці. Нарэшце, на восеньскай сесіі традыцыйна разглядаецца пакет бюджэтных законапраектаў, да якіх сёлета будуць прад'яўляцца асаблівыя патрабаванні.

Прама ці ўскосна ўсе плануемыя рашэнні будуць працаваць на павышэнне ВУП. Аднак не будзем забываць, што вельмі многае тут залежыць ад кемлівасці мясцовых улад, прадпрымальнасці вытворцаў, іх напорыстасці і здольнасці адаптавацца да сітуацыі на знешнім і ўнутраным рынках, якая пастаянна змяняецца. Таму дэпутаты значную ўвагу ўдзяляюць вывучэнню практыкі прымянення законаў, праводзяць парламенцкія слуханні, круглыя сталы, выязныя пасяджэнні камісій, падтрымліваюць дыялог з прадстаўнікамі дзелавых колаў. Усё гэта таксама аказвае свой уплыў на змяненне бізнес-клімату ў краіне.

***— А як, дарэчы, прасоўваецца падрыхтоўка да парламенцкіх слуханняў па інвестыцыйнай тэматыцы? Калі яны адбудуцца?***

— Падрыхтоўка ідзе поўным ходам. Тут якраз нам сур'ёзна дапамагаюць і нашы заканадаўчыя напрацоўкі, і аналіз сітуацыі на месцах. Падчас абмеркавання паправак у закон «Аб інвестыцыях» мы атрымалі мноства прапаноў, якія датычацца цэлага комплексу прававых і арганізацыйных пытанняў у гэтай сферы. Каб больш аб'ектыўна ўявіць сабе агульную карціну, дэпутаты ўважліва вывучалі вопыт рэалізацыі такіх буйных інвестыцыйных праектаў, як Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», Парк высокіх тэхналогій, ЗАТ «Штадлер Мінск». Вынікі праведзенай работы і ляглі ў скарбонку таго, што нам трэба будзе абмяркоўваць з прадстаўнікамі бізнесу, замежных інвестараў, юрыдычных кампаній, рэспубліканскіх і мясцовых органаў кіравання і самакіравання. У цяперашні час пры актыўным удзеле Міністэрства эканомікі вярстаецца праграма слуханняў, і мы разлічваем, што зможам іх правесці ўжо ў лістападзе гэтага года.

***— Чакаецца, што восенню ў Палату прадстаўнікоў паступіць абноўлены Падатковы кодэкс. Дэпутаты прымаюць дастаткова актыўны ўдзел у яго распрацоўцы. Якія ініцыятывы вылучаюць парламентарыі ў частцы ўдасканалення падатковай палітыкі?***

— Самае галоўнае тут — стварыць празрыстую і дружалюбную для ўсіх сістэму, у якой падатковыя службы не будуць бачыць у плацельшчыку патэнцыйнага парушальніка, а плацельшчык — ворага ў асобе інспектара. Аднак не трэба забываць і пра тое, што падаткі напаўняюць бюджэт краіны, перад якім стаяць важныя сацыяльныя задачы. Таму Падатковы кодэкс павінен быць зразумелым, стабільным і збалансаваным дакументам.


Фота БелТА.

Сярод навацый, якія ўнеслі ў кодэкс парламентарыі, можна назваць, напрыклад, адмену права мясцовых Саветаў дэпутатаў павялічваць да 10 разоў стаўкі падатку на нерухомасць па невыкарыстоўваемых і неэфектыўна выкарыстоўваемых аб'ектах, а таксама зямельнага падатку на зямельныя ўчасткі, занятыя такімі аб'ектамі. Акрамя таго, дэпутаты выступілі за скасаванне двухпрацэнтнай стаўкі падатку на нерухомасць у дачыненні да аб'ектаў звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва.

Яшчэ адна навіна заключаецца ў тым, што для індывідуальных прадпрымальнікаў будзе прадугледжана індэксацыя крытэрыяў выручкі з мэтай прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання (на параметр інфляцыі). У праекце ўлічаны шэраг дэпутацкіх ініцыятыў па ўдасканаленні прымянення падатковых ільгот, распрацавана методыка ацэнкі іх эфектыўнасці, якая таксама будзе замацавана ў кодэксе.

***— Грамадскасць пільна сочыць за работай па абнаўленні Кодэкса аб адукацыі. Ці плануецца правядзенне парламенцкіх слуханняў па гэтым дакуменце?***

— Пакуль гэтае пытанне застаецца адкрытым. Калі памятаеце, паўгода таму праект новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі ўжо выносіўся на грамадскае абмеркаванне. Парламентарыі, дарэчы, актыўна падключыліся да гэтага працэсу. Дакумент выклікаў шырокі водгук. І асобныя прапановы паступаюць да гэтага часу. Усе яны павінны быць дэталёва прааналізаваны, а для гэтага Міністэрству адукацыі патрабуецца час.

Адукацыя — наш стратэгічны рэсурс і вельмі далікатная сфера. Бо вынікі прынятых рашэнняў можна будзе ацаніць адэкватна толькі гадоў праз 20. Таму спешкі ў такой адказнай справе быць не павінна, лепш сем разоў адмераць. Давайце ўсё ж такі дачакаемся афіцыйнага ўнясення законапраекта ў Палату прадстаўнікоў, і тады ўжо свае слова скажуць дэпутаты. У любым выпадку магу сказаць, што работу над ім мы будзем весці максімальна адкрыта.

***— Парламентарыі прымаюць самы непасрэдны ўдзел у рэалізацыі Дэкрэта № 1 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва», яны ўключаны ў склады адпаведных камісій. Як вы лічыце, наколькі з моманту пачатку рэалізацыі дэкрэта ўдалося актывізаваць і скаардынаваць работу органаў улады? Якія заканадаўчыя рашэнні могуць спатрэбіцца для таго, каб і надалей стымуляваць занятасць і самазанятасць? Як вы лічыце, ці трэба перагледаць пералік сацыяльных паслуг, якія працаздольныя непрацуючыя грамадзяне будуць аплачваць у поўным аб'ёме?***

— Дэкрэт дазволіў, нарэшце, зрушыць справу з мёртвага пункта. Калі раней органы ўлады рухаліся ў гэтым кірунку, скажам так, навобмацак, то зараз у нас створана даволі стройная сістэма ўзаемадзеяння мясцовых адміністрацый, органаў занятасці, МУС, сацыяльных службаў, сістэмы адукацыі.

Усяго ў Беларусі дзейнічаюць ужо каля 150 камісій па садзейнічанні занятасці. Актыўны ўдзел у іх дзейнасці прымаюць і дэпутаты. Работа ідзе планамерна, у ёй стала менш фармалізму, а вывучэнне праблемных жыццёвых сітуацый, у якіх аказваюцца людзі, дазваляе распрацоўваць гнуткія сцэнарыі іх вырашэння. І вынікі не прымусілі сябе чакаць. Многія грамадзяне ўжо скарысталіся магчымасцю ўладкавацца на працу, прайсці перападрыхтоўку, адкрыць або вывесці з ценю свой бізнес. Толькі за першае паўгоддзе па дапамогу ў працаўладкаванні ў камісіі звярнулася каля 4 тысяч чалавек. І гэта, пагадзіцеся, дастаткова пазітыўны сігнал.

Якія крокі яшчэ трэба прадпрымаць у гэтым кірунку? Лічу, што неабходна паслядоўна вырашаць усе пастаўленыя кіраўніком дзяржавы задачы па лібералізацыі эканамічнай дзейнасці, развіцці малога і сярэдняга бізнесу, разняволенні дзелавой ініцыятывы і ўдасканаленні працоўных адносін. На маючай адбыцца сесіі, напрыклад, плануецца ўнясенне шэрагу паправак у Працоўны кодэкс. Асноўная мэта такой работы — умацаванне правоў працоўных і павышэнне іх мабільнасці. Частка навацый законапраекта датычыцца работы дыстанцыйных работнікаў. З улікам развіцця лічбавых тэхналогій такіх спецыялістаў у нас будзе становіцца ўсё больш. Таму ўжо сёння неабходна сур'ёзна задумацца аб урэгуляванні грамадскіх адносін у гэтай перспектыўнай для Беларусі сферы эканомікі.

Што ж датычыцца пераліку паслуг, якія трэба будзе аплачваць у поўным аб'ёме, то, мяркую, казаць аб яго пашырэнні або скарачэнні пакуль заўчасна. Трэба абкатаць створаны механізм, каб выявіць усе яго перавагі і недахопы. Працуючы ў акругах, дэпутаты трымаюць гэтыя пытанні на асаблівым кантролі.

***— Развіццё міжпарламенцкіх кантактаў — яшчэ адзін важны кірунак дзейнасці Палаты прадстаўнікоў. На якіх вектарах плануюць засяродзіць намаганні парламентарыі?***

— Нашы міжпарламенцкія сувязі ахопліваюць практычна ўсе рэгіёны свету, што цалкам адпавядае прынцыпу шматвектарнасці беларускага знешнепалітычнага курсу. У Нацыянальным сходзе створана 75 парламенцкіх груп дружбы і тры міжпарламенцкія камісіі.

Да канца года мы чакаем прыняць у сябе парламенцкія дэлегацыі з Егіпта, Кітая і Румыніі. Беларускія дэпутаты плануюць наведаць Германію, Канаду, Турцыю, Швейцарыю, дзе пройдзе шэраг двухбаковых і шматбаковых парламенцкіх сустрэч. Дэлегацыі Нацыянальнага сходу возьмуць удзел у планавых мерапрыемствах Міжпарламенцкага саюза і Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Натуральна, гэты пералік у ходзе сесіі будзе карэктавацца.

Нароўні з вырашэннем чыста палітычных пытанняў мы стараемся садзейнічаць развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, нарошчванню і дыверсіфікацыі беларускага экспарту, прасоўванню вобраза Беларусі на сусветнай арэне як IT-краіны. У гэтых мэтах мы цесна ўзаемадзейнічаем з урадам, гандлёва-прамысловай палатай і іншымі зацікаўленымі. Зразумела, найважнейшым напрамкам для нас застаецца еўразійская інтэграцыя. Вядучую ролю ў яе развіцці мае стратэгічнае супрацоўніцтва з краінамі СНД, перш за ўсё з Расійскай Федэрацыяй. Таму мы асаблівую ўвагу ўдзяляем мерапрыемствам Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

***— Раскажыце падрабязней, як будзе выбудоўвацца ўзаемадзеянне з расійскімі калегамі, у тым ліку ў вырашэнні праблемных пытанняў, якія перыядычна ўзнікаюць у гандлёва-эканамічных адносінах дзвюх краін.***

— Прэтэнзіі, якімі час ад часу абменьваюцца саюзнікі, — не вельмі прыемная, але цалкам звычайная рэч. Ні адзін інтэграцыйны працэс у свеце не працякае без неладоў. І ўсё ж нельга адмаўляць відавочнага: у параўнанні з іншымі постсавецкімі дзяржавамі Беларусь і Расія далей за ўсіх прасунуліся па шляху інтэграцыі.

Задача саюзных парламентарыяў у тым, каб задаваць канструктыўны тон у нашых адносінах і дзелавую атмасферу пры вырашэнні вострых праблем двухбаковага парадку. І трэба сказаць, што ў гэтым пытанні нашы расійскія калегі цалкам з намі салідарныя. Сумеснымі намаганнямі мы стараемся прасоўваць тэму, якая больш за ўсё сёння хвалюе людзей, — роўнасць правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання.

Гэтая работа вядзецца пастаянна, метадычна і ў розных фарматах. Сёлета мы стараемся больш актыўна далучаць да гэтага працэсу профільныя міністэрствы і ведамствы. Вынікі гэтай работы кладуцца ў аснову нашай заканадаўчай дзейнасці.

***— А ці ёсць зрухі ва ўсталяванні сувязяў з амерыканскімі парламентарыямі, ці плануюцца якія-небудзь кантакты з імі сёлета?***

— У нас складваюцца дастаткова канструктыўныя адносіны з Лацінаамерыканскім парламентам. Нацыянальны сход Беларусі мае статус пастаяннага назіральніка ў гэтай міжнароднай арганізацыі, і ў гэтай якасці мы атрымалі магчымасць крок за крокам нарошчваць свае кантакты з краінамі рэгіёна. А літаральна на днях мы прымалі ў Мінску прадстаўнічую дэлегацыю Лацінаамерыканскага парламента (ПАРЛАЦІНА) на чале з яго старшынёй Эліясам Касільё. Мяркую, візіт надасць новы імпульс развіццю супрацоўніцтва.

Калі ж вы маеце на ўвазе парламентарыяў ЗША, то, зразумела, мы адкрыты для развіцця дыялогу і з імі. У чэрвені бягучага года, напрыклад, беларускія дэпутаты прымалі ўдзел у парламенцкім форуме па пытаннях разведкі і бяспекі. Гэтае мерапрыемства ўжо некалькі гадоў праводзіцца ў розных краінах па ініцыятыве аднаго з кангрэсменаў ЗША. Галоўным тэмамі дыскусій тут з'яўляюцца актуальныя выклікі і пагрозы сусветнай бяспецы і тая роля, якую павінны адыграць у іх прадухіленні Злучаныя Штаты і Еўропа.

На палях форуму, які праходзіў сёлета летам у Берліне, адбылася сустрэча з амерыканскімі кангрэсменамі, якія цёпла і пазітыўна адазваліся пра Беларусь і выказалі зацікаўленасць наведаць краіну. Мы накіравалі ім адпаведнае запрашэнне. Не выключана, што да канца года гэты візіт адбудзецца. У любым выпадку нашы кантакты працягнуцца, паколькі нас ужо запрасілі прыняць удзел у чарговым парламенцкім форуме, які пройдзе ў снежні ў Вашынгтоне.

***— Уладзімір Паўлавіч, вы з'яўляецеся ўпаўнаважаным кіраўніка дзяржавы па Віцебскай вобласці. Якімі вам бачацца сацыяльна-эканамічныя перспектывы рэгіёна ў цэлым і Аршанскага раёна ў прыватнасці, паколькі сітуацыя ў раёне знаходзіцца пад пільнай увагай Прэзідэнта?***

— З пункту гледжання перспектыў развіцця ўсе рэгіёны Беларусі знаходзяцца прыкладна ў роўных умовах. Зразумела, у кожнага з іх свае праблемы, але ёсць і бясспрэчныя канкурэнтныя перавагі. Вось на іх і трэба рабіць стаўку ў першую чаргу. На гэта пастаянна ўказвае кіраўнік дзяржавы.

Прыклад Оршы гаворыць пра тое, што кожны кіраўнік павінен няўхільна выконваць даручэнні Прэзідэнта. Галоўны крытэрый ацэнкі работы нашай эканомікі — стварэнне высокаэфектыўных рабочых месцаў, павышэнне прадукцыйнасці працы і, як следства, даходы.

Другі важны момант — жорсткая кіраўніцкая, выканаўчая і тэхналагічная дысцыпліна. Прычым гэта датычыцца не толькі тых, хто непасрэдна прымае рашэнні. Кожны грамадзянін незалежна ад узросту, прафесіі, дастатку або месца жыхарства павінен адчуваць прыналежнасць да лёсу сваёй Радзімы. Толькі агульнымі намаганнямі мы зможам супрацьстаяць няпростым выклікам часу, забяспечыць эканамічны рост, а значыць, і павышэнне дабрабыту насельніцтва Беларусі.

■ Ва ўрадзе

# Будкомплекс можна крэдытаваць больш

## Сяргей Румас пакрытыкаваў недастатковае выкарыстанне патэнцыялу будаўнічай галіны

**Праект стратэгіі развіцця будаўнічай галіны Беларусі да 2025 года і план мерапрыемстваў па яе рэалізацыі разгледзелі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Прадстаўнікі Мінбудархітэктуры зрабілі справаздачу аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы па забеспячэнні эфектыўнага функцыянавання галіны.**

Прэм'ер-міністр Сяргей Румас адзначыў, што створаныя ў краіне ўмовы дазваляюць выкарыстоўваць новыя пункты росту і адысці ад залежнасці ў бюджэтным фінансаванні будаўнічага комплексу. Прынятыя ўрадам і Нацбанкам меры па стрымліванні інфляцыі пашырылі доступ да рэсурсаў камерцыйных банкаў на досыць камфортных умовах. Кіраўнік урада лічыць, што магчыма больш шырокае выкарыстанне патэнцыялу банкаўскай сістэмы пры будаўніцтве сацыяльнай, інжынернай і транспартнай інфраструктуры.

Паводле яго слоў, за мінулы час у краіне істотна выраслі вытворчыя магутнасці будаўнічага комплексу — як падрадных прадпрыемстваў, так і арганізацый прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, значна павялічыўся кадравы патэнцыял галіны.

«Аднак, сёння, зыходзячы з прадстаўленых дакументаў, гэты патэнцыял выкарыстоўваецца недастаткова эфектыўна», — мяркуе прэм'ер-міністр.

Пры гэтым Сяргей Румас падкрэсліў, што для ацэнкі эфектыўнасці работы будаўнічай галіны павінны быць абгрунтаваныя крытэрыі. У цэнтры ўвагі застанецца і рашэнне жыллёвага пытання: неабходна забяспечыць ва ўстаноўленыя тэрміны жыллём усе шматдзетныя сем'і, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу больш за адзін год.

Прэм'ер нагадаў, што ў 2013 годзе работа будаўнічага комплексу была падрабязна разгледжана на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы. Усе неабходныя рашэнні прынятыя і рэалізуюцца.

«Разам з тым умовы работы як на знешніх, так і на ўнутраным рынках дынамічна змяняюцца. Гэта ўплывае на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў цэлым і будаўнічага комплексу ў прыватнасці. Мы павінны адэкватна і своечасова рэагаваць на гэтыя змены», — падкрэсліў кіраўнік урада.

На пасяджэнні таксама абмяркоўвалася пытанне нарошчвання экспарту будаўнічых паслуг і яго далейшая дыверсіфікацыя. Не абмінулі і тэму выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па развіцці рынку авіяцыйных перавозак, павышэння яго прывабнасці для насельніцтва і развіцця транзітнага патэнцыялу краіны ■

# У КДК ацанілі страты Мінэнерга ў 120 мільёнаў долараў

**Камітэт дзяржкантролю ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы праверыў абгрунтаванасць выдаткаў, якія ўключаны ў сабекошт вытворчасці цеплавой і электрычнай энергіі арганізацыямі Мінэнерга. Падчас падвядзення вынікаў праверкі на пасяджэнні калегіі Камітэта старшыня КДК Леанід АНФІМАЎ адзначыў, што ў энергетыцы выяўлены нявыкарыстаныя рэзервы зніжэння выдаткаў на агульную суму больш за 120 мільёнаў долараў.**

«Меры па рэалізацыі рэзерваў з незразумелых прычын або не прымаюцца, або недапушчальна зацягваюцца на працяглы перыяд. Гэта ў першую чаргу датычыцца зніжэння страт у ацяпляльных сетках. Іх мадэрнізацыя праводзіцца вельмі нізкімі тэмпамі», — адзначыў Леанід Анфімаў.

Напрыклад, на балансе прадпрыемства «Мінскія цеплавыя сеткі» знаходзіцца 1400 кіламетраў труб з тэрмінам эксплуатацыі больш за 25 гадоў. У цэлым па энергасістэме замена зношаных труб на папярэдне ізаляваныя (ПІ-трубы) магла б забяспечыць эканамічны эфект у памеры больш за 40 мільёнаў долараў. А гэта рэальная магчымасць для зніжэння як сабекошту энергарэсурсаў, так і тарыфаў для спажыўцоў. Зацягнутую мадэрнізацыю цеплавых сетак энергетыкі, як правіла, тлумачаць дэфіцытам сродкаў.

«Значны аб'ём фінансавання накіроўваецца на мэты, якія не звязаны з павышэннем эфектыўнасці энергасістэмы, яе эканамічнасці і надзейнасці. У той жа час на закупку дарагіх аўтамабіляў, на будаўніцтва новага офіснага будынка для «Белэнерга» — грошы знаходзяцца», — падкрэсліў Леанід Анфімаў.

Гаворка ідзе пра будаўніцтва сяміпавярховага офіснага будынка плошчай у сем тысяч квадратных метраў у цэнтры Мінска для размяшчэння апарату «Белэнерга», куды ўжо ўкладзена каля 2,9 мільёна долараў у эквіваленце. У цэлым жа кошт праекта ацэньваецца ў дзевяць мільёнаў долараў.

Акрамя гэтага, дапускаецца марнатраўнае расходаванне сродкаў пры закупках матэрыялаў і камплектуючых. Так, у сакавіку 2018 года арганізацыяй «Белэнергазабеспячэннекамплект» (створана для правядзення цэнтралізаваных закупак) па замове «Гомельэнерга» праведзены конкурс на закупку 90 тон рэагенту для падрыхтоўкі вады на Мазырскай ЦЭЦ. Перавага была аддадзена літоўскай кампаніі, нягледзячы на тое, што айчынны вытворца прапаноўваў гэтую прадукцыю ў 2,5 раза танней. За тавар пераплацілі больш за 42 тысячы еўра.

«Па выніках праверкі ў КДК зрабілі выснову, што даручэнні кіраўніка дзяржавы аб выключэнні неабгрунтаваных затрат з сабекошту вытворчасці цеплавой электрычнай энергіі энергетыкі выконваюць не ў поўным аб'ёме», — растлумачыў **начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за працай галін сферы матэрыяльнай вытворчасці Камітэта дзяржаўнага кантролю Станіслаў НАРКЕВІЧ.**

Ён таксама адзначыў, што кіраўнікі энергетычнай галіны, якія дапусцілі неэфектыўнае і неабгрунтаванае выкарыстанне грашовых сродкаў і парушэнне заканадаўства, будуць прыцягнутыя да адказнасці. Адпаведная прапанова накіравана ў Савет Міністраў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# І ЗГУЛЯЛІ Ў «БУЛЬБАТЛОН»

## Адбыўся злёт студэнцкіх атрадаў Беларусі і Расіі «Моладзь будуе Саюз»

**Мерапрыемства, якое адбылося ў канцы мінулага тыдня, арганізавалі ў рамках V Форуму рэгіёнаў дзвюх краін, і ў такім фармаце яно праходзіла ўпершыню. Ідэя яго правядзення з'явілася на чацвёртым форуме летась. У злёце бралі ўдзел некалькі сотняў байцоў, камандзіраў і камісараў студэнцкіх атрадаў Саюзнай дзяржавы.**



Сёлета ў так званым трэцім працоўным семестры ў Расійскай Федэрацыі працавалі многія беларускія студэнцкія будаўнічыя, педагагічныя, сэрвісныя і сельскагаспадарчыя атрады з Беларусі. Геаграфія іх працоўнай дзейнасці была шырокай: ад Санкт-Пецярбурга да Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі...

Студэнты з Расіі, у сваю чаргу, працавалі ў нашай краіне на ўсебеларускай маладзёжнай будоўлі аб'екта першай айчыннай АЭС, у Мінску будавалі інтэрнат «Студэнцкай вёскі».

Месцам правядзення злёту выбралі Віцебшчыну, бо тут побач знаходзяцца старажытны Полацк і Наваполацк, якому сёлета споўнілася 60 гадоў. Апошні, як вядома, быў калісьці ўсесаюзнай будоўляй. Сам горад, вядомыя прадпрыемствы-гіганты нафтаперапрацоўчай і хімічнай галіны ўзводзілі прадстаўнікі розных рэспублік СССР. Многія засталіся жыць і працаваць у Беларусі. І гэта — адна з асаблівасцяў горада над Заходняй Дзвіной.

Студэнцкія будаўнічыя атрады Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта годна працягваюць слаўныя традыцыі. Гэта пацвярджаецца і тым, што атрад «Эўрыка» некалькі разоў быў прызнаны найлепшым у краіне.

Сярод ганаровых гасцей маладзёжнага форуму былі беларускія парламентарыі, работнікі Віцебскага аблвыканкама, Наваполацкага гарвыканкама, прадстаўнікі ЦК Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, актывісты камсамола часоў СССР Беларусі і Расіі.

Трохдзённая праграма злёту была насычаная разнастайнымі мерапрыемствамі. У першы дзень моладзь пазнаёмілася, паўдзельнічала ў квэсце, спеўцы каля вогнішча.

У другі — арганізавалі акцыю «Памяць пакаленняў», падчас якой усклалі кветкі да мемарыяльнага комплексу «Першая палатка» ў Наваполацку. Менавіта там больш за 60 гадоў таму пасяліліся першыя будаўнікі. Дзякуючы ім, на карце БССР з'явілася новая кропка — горад, які і цяпер лічыцца адным з самых маладых на постсавецкай прасторы.

Усе ахвотныя змаглі паўдзельнічаць у «Адкрытай трыбуне», каб атрымаць адказы ад прадстаўнікоў улады, кіраўнікоў маладзёжных арганізацый. Як той казаў, мікрафон «не змаўкаў». Тых, хто задаваў пытанні, цікавілі магчымасці зарабіць непаўналетнім, падатковыя льготы, нюансы пры размеркаванні на работу. Пыталі і пра шанцы працаваць у атрадах на тэрыторыі іншых краін. Дарэчы, кіраўніцтвам БРСМ абмяркоўваецца перспектыва налета папрацаваць прадстаўнікам Беларусі ва Узбекістане, Казахстане. Агучваліся і іншыя навіны.

У праграме злёту былі майстар-класы, адукацыйныя пляцоўкі, шчыры «Дыялог пакаленняў», трэнінгі, творчы фэст, спартыўныя спаборніцтвы. Упершыню ў праграму апошніх быў уключаны «Бульбатлон». І забаў было багата: фаер-шоу, вечарынка з танцамі і конкурсамі «Байцоўка-Паці», дыскатэкі.

Апроч гэтага, будатрадаўцы дружна папрацавалі на добраўпарадкаванні тэрыторыі Лядовага палаца «Хімік», які зараз рэканструююць.

Расійскія «байцы» былі ўражаныя прыгажосцю Полацка з яго храмамі, старымі вулачкамі, утульнымі скверамі і паркамі. Горад славіцца і сваімі скульптурамі. Напрыклад, прысвечанай унікальнай беларускай літары «Ў».

Удзельнікі злёту выказалі ўдзячнасць арганізатарам за тое, што цікава правялі тры дні, якія ім запомняцца, бадай, на ўсё жыццё.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Наваполацк — Полацк — Віцебск.*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ІДЗЕ ПРЫЗЫЎ ЗАПАСНІКОЎ

**З 24 верасня ва Узброеных Сілах праводзіцца другі этап комплекснай праверкі. Яна скіравана на тэставанне гатоўнасці і здольнасці злучэнняў і воінскіх часцей выконваць задачы па прызначэнні. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.**

650 ваеннабавязаных з запасу на працягу некалькіх сутак будуць прызваны ва ўпраўленне аднаго са злучэнняў рэзерву, а таксама ў падраздзяленні 46-га арсенала і 8-й брыгады радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. Таксама туды паступяць каля 20 адзінак тэхнікі. Акрамя таго, працягваецца атрыманне матэрыяльных сродкаў са складоў і баз захоўвання.

Праверка дазволіць вызначыць узровень зладжанасці органаў кіравання, здольнасць камандзіраў кіраваць падначаленымі воінскімі часцямі і падраздзяленнямі ў розных умовах абстаноўкі, а таксама вызначыць магчымасць падраздзяленняў выконваць пастаўленыя задачы ў складаных умовах.

Кіруе мерапрыемствамі **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь Алег БЕЛАКОНЕЎ.** Праверка скончыцца правядзеннем штабных трэніровак і тактыка-спецыяльных вучэнняў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## НЕПАГАДЗЬ НАПРАКУДЗІЛА... І ГЭТА НЕ ЎСЁ?

**У панядзелак над рэгіёнамі Беларусі прайшоўся моцны вецер. Па інфармацыі МНС, фіксаваліся пашкоджанні легкавых аўтамабіляў, у тым ліку прыпаркаваных пад дрэвамі і з парушэннем ПДР, адключэнні электразабеспячэння.**

З прычыны парываў ветру (да 21 м/с) пашкоджаны дахі жылога дома і сельскагаспадарчага будынка. Работнікі МНС і іншых арганізацый 44 разы выязджалі на ліквідацыю наступстваў падзення дрэў. Яны былі зафіксаваныя ў Брэсцкай (23 выпадкі), Гомельскай (7 выпадкаў), Мінскай (1 выпадак) і Магілёўскай (13 выпадкаў) абласцях, у выніку якіх пашкоджана шэсць легкавых аўтамабіляў. Пацярпелых няма.

Удзень паступіла паведамленне аб адключэнні электраэнергіі ў гарпасёлку Лельчыцы Гомельскай вобласці (аб'екты 1-й катэгорыі былі засілкаваны ад рэзервовых крыніц), якое праз гадзіну было аднаўлена. Прычына — падзенне дрэва на высакавольтную лінію.

Па звестках «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 488 населеных пунктаў. Усе адключэнні аператыўна ліквідаваны. Паводле інфармацыі Белгідрамета, складаныя ўмовы надвор'я ў найбліжэйшы час захаваюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШАЛЁНАЯ ЛІСА БЕГАЛА ПА ЛУНІНЦЫ

**Для жывёліны не сталі перашкодай нават двухметровыя агароджы, яна іх лёгка пераскоквала. Ліса накідвалася на сабак, душыла курэй. Яе заўважалі гараджане ў раёне вуліц Скарыны, Багданава і Дружнай.**



Спачатку ліса апынулася ў двары дома па вуліцы Дружнай і загрызла сабаку, а потым пабегла ў іншыя двары. У жывёлы былі ўсе прыкметы хваробы, яна не баялася, паводзіла сябе неадэкватна. І лунінчане паведамілі аб гэтым у службу па надзвычайных сітуацыях і райветстанцыю. Жывёліну забілі, матэрыял накіравалі ў лабараторыю для даследавання. Як паведамілі ў раённай ветэрынарнай станцыі, факт шаленства жывёліны афіцыйна пацверджаны. Сабакі, якім раней былі зробленыя прышчэпкі ад шаленства, некаторы час будуць назірацца ветурачамі. Непрышчэпленых жывёлін давялося ўсыпіць. Паводле санітарных і ветэрынарных правілаў, на вуліцах, дзе бегала шалёная ліса, на месяц будзе ўведзены каранцін.

У Лунінецкім раёне сёлета ўжо рэгістраваўся выпадак захворвання дамашняй жывёлы на шаленства. Кот у пасёлку Палескім накінуўся на гаспадыню і пакусаў яе, а потым раптоўна памёр. Жанчына бачыла, што днём ці двума днямі раней кот еў з вожыкам з адной міскі. Аналіз пацвердзіў захворванне хатняй жывёлы небяспечнай хваробай. А гаспадыні давялося прайсці курс прафілактычнага лячэння. Ветэрынары яшчэ раз нагадваюць аб правілах бяспекі ў адносінах да дамашніх гадаванцаў. Шаленства — хвароба смяротная як для жывёлы, так і для чалавека. Сабак і катоў варта прышчэпліваць ад гэтай хваробы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# НА ПОЎДНІ ПАЛЕССЯ Ў ХУТКІМ ЧАСЕ ЗІМЫ НЕ БУДЗЕ

## Такія прагнозы на будучыя дзесяцігоддзі даюць беларускія метэаролагі

**Айчынныя эксперты вызначылі, як зменіцца наш клімат у найбліжэйшыя дзесяцігоддзі. Пра гэта ідзе гаворка ў аналітычнай запісцы «Агракліматычнае занаванне тэрыторыі Беларусі з улікам змены клімату». Мы прыводзім знакавыя вытрымкі з гэтага даследавання.**

### НА 2,7 ГРАДУСА ЦІ НАВАТ ЯШЧЭ БОЛЬШ?

З 1989 года ў нас пачаўся самы працяглы перыяд пацяплення за ўвесь час інструментальных назіранняў на працягу апошніх амаль 130 гадоў. За гэты час сярэднегадавая тэмпература паветра ў нашай краіне на 1,3 градуса перавысіла кліматычную норму. У 2015 годзе сярэдняя гадавая тэмпература паветра склала плюс 8,5 градуса, што на 2,7 градуса вышэй за кліматычную норму і сталася самай высокай за ўвесь перыяд, пачынаючы з 1881 года. У выніку пацяплення адбылася змена межаў агракліматычных зон (абласцей): Паўночная агракліматычная вобласць распалася, а на поўдні Беларускага Палесся ўтварылася новая, больш цёплая агракліматычная вобласць. Даследаванні паказваюць, што тэндэнцыі гэтых змен у наступныя дзесяцігоддзі захаваюцца.

### ПАШЫРЫЛІСЯ ПАСЕВЫ СЛАНЕЧНІКУ, АГАРОДНІННАГА ГАРОШКУ І СПАРЖАВАЙ ФАСОЛІ

Экспертныя ацэнкі паказваюць, што ўмовы надвор'я прыводзяць да змены валавога прадукту сельскай гаспадаркі ў краіне як мінімум на 15—20 %. У апошнія 20 гадоў у краіне назіраецца наступная эканамічна значная асаблівасць: сярэдні валавы збор збожжа прыкладна 7—8 млн тон, але ў неспрыяльныя па ўмовах надвор'я гады зніжаецца да 5,5—6 млн тон, а ў спрыяльныя — дасягае 9,5 млн тон. Спецыялісты прадказваюць непазбежнасць перабудовы ўсіх сістэм вядзення сельскай гаспадаркі ў выніку зрушэння зон у паўночным напрамку на значныя адлегласці. Так, цяпер ажыццяўляюцца канкрэтныя мерапрыемствы па адаптацыі сельскай гаспадаркі да змены клімату. За апошнія гады значна павялічыліся пасяўныя плошчы кукурузы на зерне. У гаспадарках Брэсцкай і Гомельскай абласцей укараняецца ў вытворчасць азімы ячмень, уборку яго пачынаюць на два-тры тыдні раней за іншыя культуры. Гэта таксама дзякуючы павелічэнню сумарных тэмператур у чэрвені—ліпені. Узраслі пасяўныя плошчы рапсу на насенне. У паўднёвых абласцях штогод праводзіцца пасеў соі (да пяці тысяч га), пашырыліся пасевы сланечніку, агародніннага гарошку, цукровай кукурузы, спаржавай фасолі.

**Працягласць цёплага перыяду з сумай тэмператур паветра вышэй за нуль да 2041—2060 гадоў у сярэднім узрасце на 35 дзён і будзе вагацца ад 280 да 310 дзён. «А на крайнім паўднёвым захадзе ў раёне Брэста сярэдняя працягласць такога перыяду складзе 365 дзён, гэта значыць зімы не будзе».**

Асвоена вырошчванне ранніх цеплалюбівых сартоў бульбы. Праягваюцца работы па стварэнні прамысловых плантацый вінаграду, вядуцца работы па пашырэнні плошчаў бахчавых культур.

### КЛІМАТ ПАДЧАС ПАЦЯПЛЕННЯ

Упершыню змена межаў агракліматычных абласцей у выніку сучасных змен клімату і з'яўленне новай агракліматычнай вобласці адзначана ў 2004 годзе. Цёплае надвор'е ў перыяды актыўнай вегетацыі наступных гадоў (асабліва анамальна спякотнае лета ў 2010, 2014, 2015 гадах) яшчэ больш змянілі мяжу агракліматычных абласцей і пашырылі межы новай агракліматычнай вобласці. Яе мяжа на Гомельшчыне зрушылася на поўнач, асабліва на паўднёвым усходзе рэгіёна.

Клімат Беларусі вызначаюць як умерана кантынентальны. Сярэднегадавая тэмпература паветра складае 7,1 градуса. Сярэднегадавыя тэмпературы змяняюцца ад плюс 6,4 градуса ў Віцебскай вобласці да плюс 7,8 градуса ў Брэсцкай вобласці. Самы цёплы месяц ліпень — 18,9 градуса, самы халодны студзень — мінус 3,9 градуса. Гадавая сума ападкаў складае 652 мм найбольшая колькасць ападкаў выпадае на Навагрудскім узвышшы — у сярэднім 745 мм, найменшая — на захадзе краіны, у Гродне — за год у сярэднім выпадае 548 мм ападкаў. Каля 70 % гадавой сумы ападкаў прыпадае на цёплы перыяд, калі ідуць ліўневыя дажджы.

Снежнае покрыва на тэрыторыі краіны ляжыць ад 64 дзён — на паўднёвым захадзе і да 115 дзён — на паўночным усходзе.

### ДВА СЦЭНАРЫІ — НІВОДНАГА ПАХАЛАДАННЯ

Даследчыкі вывучылі некалькі кліматычных мадэляў, каб спрагназаваць змены клімату. Аўтары разглядаюць два сцэнарыі: сярэдняга антрапагеннага радыяцыйнага ўздзеяння і жорсткага. Другі сцэнарый ацэньваецца як малаверагодны.

Прагнозы, зробленыя на перыяд 2010—2039 гадоў, паказваюць павелічэнне сярэднегадавой тэмпературы паветра на адзін градус. Паводле першага сцэнарыя прагнозныя ацэнкі агракліматычных паказчыкаў наступныя: пачатак перыядаў з тэмпературай вышэй за 10 градусаў можна чакаць вясной на 3—7 дзён раней, а ўвосень яны будуць заканчвацца на 2—6 дзён пазней, што забяспечыць павелічэнне працягласці вегетацыйнага перыяду амаль на два тыдні.

Больш за тое, працягласць цёплага перыяду з сумай тэмператур паветра вышэй за нуль да 2041—2060 гадоў у сярэднім узрасце на 35 дзён і будзе вагацца ад 280 да 310 дзён. «А на крайнім паўднёвым захадзе ў раёне Брэста сярэдняя працягласць такога перыяду складзе 365 дзён, гэта значыць зімы не будзе», — сказана ў дакуменце. Сярэднія тэмпературы ў розныя поры года вырастуць на 1,6—2,4 градуса. Чакаецца нязначнае павелічэнне колькасці ападкаў восенню і зімой. Увесну і ўлетку іх колькасць практычна не зменіцца, але ўвільгатненне сельгаскультур летам знізіцца з-за павышэння тэмпературы паветра.

Жорсткі сцэнарый прадугледжвае павелічэнне цёплага перыяду з сумай тэмператур паветра вышэй за нуль да 2041—2060 гадоў на 54 дні. Сярэднія тэмпературы ў розныя поры года вырастуць на 2,3—3,1 градуса. У гэтым выпадку летам з-за высокіх тэмператур і недахопу вільгаці засушлівасць тэрыторыі будзе ўзрастаць, што запатрабуе ўнясення змен у тэхналогіі вырошчвання шэрагу сельгаскультур.

У наступныя дзесяцігоддзі ў краіне чакаюцца новыя змены межаў агракліматычных зон. «Цэнтральная агракліматычная вобласць да 2030 года фактычна распадзецца, а яе месца зойме былая паўднёвая вобласць. Пры гэтым практычна на ўсёй тэрыторыі краіны магчыма будзе вырошчванне кукурузы на зерне, сланечніку. Новая агракліматычная вобласць прасунецца далёка на поўнач і зойме месца паўднёвай, а на поўдні краіны з'явіцца яшчэ больш цёплыя агракліматычныя вобласці.

### ПЛЮСОЎ БОЛЬШ, ЧЫМ МІНУСАЎ

У цэлым у шэрагу раёнаў на тэрыторыі краіны могуць скласціся больш спрыяльныя ўмовы для сельскай гаспадаркі (у прыватнасці, раслінаводства) па паказчыках забяспечанасці цяплом. Працягнецца паляпшэнне ўмоў перазімоўкі азімых культур, больш ранні надыход вясновых працэсаў і тэрмінаў сяўбы яравых культур; паскарэнне выспявання збожжавых культур і тэрмінаў іх уборкі. Рост прадукцыйнасці сельскагаспадарчай вытворчасці можа быць забяспечаны за кошт укаранення і пашырэння пасеваў больш цеплалюбівых і больш ураджайных культур, такіх як кукуруза на зерне, сланечніку, буракоў, больш цеплалюбівых кармавых (соі, люцэрны і інш.) Пасевы паржышчавых культур умацуюць кармавую базу жывёлагадоўлі.

У той жа час чакаецца пагаршэнне паказчыкаў вільгацезабяспечанасці глебы, павышэнне рызыкі засух. Гэтыя, а таксама іншыя фактары (негатыўнае ўздзеянне высокіх тэмператур, распаўсюджванне шкоднікаў і інвазійных відаў, рызыка паводак, пажараў і г. д.) могуць стаць сур'ёзнымі абмежавальнымі фактарамі для выкарыстання новых магчымасцяў.

У далейшым межы агракліматычных зон павінны ўдакладняцца не радзей аднаго разу за дзесяцігоддзе, лічаць спецыялісты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**У тэму**

### Ва Украіне прагназуюць зімы без снегу

**Пра гэта паведаміў дырэктар Укргідраметцэнтра Мікалай Кульбіда.**

«У Кіеве ў студзені сярэдняя тэмпература за апошнія 20 гадоў павялічылася на 2,4 градуса. Калі праз 20 гадоў яна вырасце на столькі ж, то ў самы халодны месяц года сярэдняя тэмпература будзе складаць толькі мінус 1,5 градуса.

Гэта значыць, у большасці дзён студзеня будзе плюсавая тэмпература і ападкаў практычна не будзе. На фоне павышэння тэмпературнага рэжыму праз 20—30 гадоў ва Украіне можа наогул не выпадаць снег», — сказаў ён.

---

**Карысныя маршруты**

# МІНСК ПАЗЕЛЯНЕЎ!

## У сталіцы адкрылася дзявятая экасцежка

**Вясной у Ленінскім раёне сталіцы, недалёка ад Лошыцкага парку, адкрылі экасцежку «Горад птушак». А цяпер побач з ёй з'явілася яшчэ адна — «Сярэбраны Лог». Новы «зялёны» маршрут працягласцю ў 800 метраў абсталявалі адукацыйнымі стэндамі і спецыяльнымі «кішэнямі» з лаўкамі.**

Уваход на экасцежку — на перасячэнні вуліц Пляханава і Якубава, пачынаецца ён з назіральнай пляцоўкі. Далей маршрут падзелены на дзве часткі — пешаходную і велаехіпедную. Мяркуецца, што хутка тут будуць праходзіць экскурсіі як для школьнікаў, так і для дарослых. Для гэтага на сцежцы ўстаноўлена дзевяць тэматычных стэндаў з інфармацыяй пра мясцовую флору і фаўну, а таксама пра некаторыя экалагічныя праблемы, напрыклад, інвазійныя віды ці лясныя пажары.

Па словах **старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргея МАСЛЯКА,** экасцежкі плануецца адкрыць у кожным раёне сталіцы, каб ніхто з жыхароў не быў абдзелены зялёнымі зонамі. Ленінскі раён у гэтым плане ўжо стаў унікальны: усяго за год тут з'явілася ажно дзве экасцежкі.

— Ідэя стварыць такія «зялёныя» маршруты ў горадзе з'явілася ўжо даўно. Нешта падобнае было зроблена ў 2010 годзе ў Цэнтральным раёне Мінска побач з заказнікам «Лебядзіны». У 2016-м гэту сцежку рэканструявалі, і ў тым жа годзе з'явілася яшчэ адна — у Каменнай Горцы.



Мы ўбачылі, што жыхарам экасцежкі падабаюцца, таму фактычна ўключылі іх у праграму добраўпарадкавання горада, — падкрэсліў Сяргей Масляк.

І дадаў, што экасцежкі сёння — аб'ект не толькі рэкрэацыйны, але і адукацыйны, і ў нейкім сэнсе нават духоўны. Яны павінны вучыць людзей здаровым зносінам з прыродай і нагадваць, колькі побач прыгажосці. Гэта вельмі важна для гарадскіх жыхароў, асабліва тых, якія рэдка бываюць у лесе ці вёсцы.

**Кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Пётр ШОСТАК** адзначыў, што з адкрыццём новай экасцежкі работа толькі пачынаецца.

— Мы стараемся прыслухоўвацца да жыхароў. Сёння людзі хочуць бачыць тут, напрыклад, яшчэ дзіцячую пляцоўку, і мы яе запланавалі. Але, хутчэй за ўсё, узнікнуць праблемы са смеццем. Цяпер за чысціню на тэрыторыі адказвае «Зелянбуд», тым не менш ад нас усіх залежыць, як будзе выглядаць сцежка праз некалькі гадоў, — падкрэсліў ён.

**Кацярына ЦІТОВА.**

**Фота аўтара**

# З ЮБІЛЕЕМ, КАЛЕГА!

**Сёння — юбілей у знакамітага вучонага-эканаміста, выдатнага чалавека, абаронцы Беларусі ў часы Вялікай Айчыннай вайны, былога партызана, які ўсё сваё жыццё прысвяціў самаадданаму служэнню Радзіме, навуцы і людзям — у Віталя Фядосавіча МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Так здарылася, што гэты шчыры беларус, ураджэнец вёскі Вугольшчына Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці з'явіўся на свет у той жа год, калі была заснавана Нацыянальная акадэмія навук Беларусі — у 1928-м. Значны час Віталь Фядосавіч, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар эканамічных навук, прафесар, працуе ў сценах гэтай установы, у Інстытуце эканомікі. Больш за тое, у пасляваенныя гады стаяў каля вытокаў адраджэння навуковай эканамічнай школы не толькі ў акадэмічных колах, але і ў краіне наогул.

За значныя заслугі перад Айчынай, у першую чаргу ў прафесійнай дзейнасці, падрыхтоўцы навуковых кадраў, за ўклад у развіццё эканомікі ўвогуле, а таксама неаднаразовае прадстаўленне інтарэсаў краіны на міжнароднай арэне ў структурах ААН Віталь Фядосавіч Мядзведзеў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». У ветэрана, партызанскага сувязнога-разведчыка, 14 франтавых медалёў.

Шчыра віншуем Вас, паважаны Віталь Фядосавіч, з бліскучым узяццем чарговай вяршыні на Вашым жыццёвым шляху і жадаем новых поспехаў, добрага здароўя, здзяйснення задуманага, як кажуць вашы калегі, на доўгатэрміновую перспектыву!

**Ірына ТОЎСЦІК,**
**вядучы навуковы супрацоўнік сектара сусветнай эканомікі Інстытута эканомікі НАН, кандыдат філалагічных навук.**


**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Крестьянскому Фермерскому Хозяйству «Александрова улитка» (УНП 391066310)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-14558, площадь – 1241,3 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – Марченская средняя школа, составные части и принадлежности: тамбур, сарай, уборная, подвал, ограждение, пешеходная часть, отмостка, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 221888502701000041, начальная цена 14 880 рублей.<br>**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-14557, площадь – 547,2 кв. м, назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – школа, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4, участок 5, участок 6), находящееся на земельном участке с кадастровым номером 221883002101000105, начальная цена 4 080,00 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Лот № 1 Витебская обл., Городокский р-н, Руднянский с/с, д. Марченки, ул. Центральная, 14.<br>Лот № 2 Витебская обл., Городокский р-н, Бычихинский с/с, д. Гурки, ул. Тюрина, 2 |
| Место, дата и время проведения торгов | 09.10.2018 г. в 12.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс (80212) 610424, (8033) 6879148 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано не позднее 15.00 08.10.2018 г.:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

Утерянную представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска квитанцию о приеме наличных денежных средств формы 1СУ серии СВ № 2497150 **считать недействительной.**

УНП 100122726

В связи с утерей **считать недействительным** свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя Акулича Дмитрия Александровича УНП 191564685.

**ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!**

Фондом «Гронооблимущество» проводится аукцион по продаже здания школы, интерната с принадлежностями, расположенного по адресу: Волковысский район, деревня Малая Лапеница, улица Школьная, дом 1, 1/1, 1/2, 1/3, 1/4, 1/5. Начальная цена продажи – 61 279 рублей 44 копейки; размер задатка – 6 200 рублей. АУКЦИОН СОСТОИТСЯ **25 октября 2018 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, дом 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **19 октября 2018 г. до 17.00.**

Подробная информация по телефонам: в городе Волковыске – (801512) 4-50-25, 4-53-83; в городе Гродно – (80152) 772915, 722518, 722102, сайты www.region.grodno.by, gki.gov.by. УНП 500580576


**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
17.09.2018 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ ВТОРОГО ВЫПУСКА Общества с ограниченной ответственностью «ПрофитЗерноМаркет»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента: на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ПрофітЗернеМаркет»; сокращенное – ТАА «ПрофітЗернеМаркет»; на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ПрофитЗерноМаркет» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ПрофитЗерноМаркет».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 35а, помещение 328; телефон: +37529350730, факс: +375172130244; официальный сайт эмитента в глобальной компьютерной сети интернет (далее – сайт эмитента): www.vladoshke.com; электронный адрес: pzm2015@tut.by.

3. Эмитент зарегистрирован решением Минского городского исполнительного комитета 21 мая 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 192479928.

4. Денежные средства, поступающие при проведении размещения облигаций настоящего выпуска, будут зачисляться в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на текущий счет эмитента в долларах США № BY 94 MTBK 3012 0001 0840 0005 6449 в Закрытом акционерном обществе «Минский транзитный банк», БИК MTBKBY22.

5. Депозитарием эмитента является депозитарий Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – ОАО «АСБ Беларусбанк»): место нахождения: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18; зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 г., номер государственной регистрации – 56; действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089.

6. Основным видом деятельности эмитента: оптовая торговля зерном, необработанным табаком, семенами и кормами для сельскохозяйственных животных; оптовая торговля прочими продуктами питания, не включенными в другие группировки.

7. Информационные ресурсы, посредством которых эмитент раскрывает информацию, определяемую законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах: единый информационный ресурс рынка ценных бумаг, газета «Звязда» и (или) официальный сайт эмитента (далее – информационные ресурсы эмитента); официальный сайт открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – организатор торговли).

8. Общее собрание участников эмитента приняло и утвердило решение о втором выпуске облигаций 8 августа 2018 г., протокол № б/н.

9. Облигации второго выпуска эмитента – именные процентные конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее совокупно именуемые – облигации).

Объем выпуска облигаций – 1 000 000 долларов США.

Количество облигаций – 1 000 штук. Номинальная стоимость облигации – 1 000 долларов США.

10. Выпуск облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – регистрирующий орган) ___.___________ 2018 г.

Государственный регистрационный номер выпуска: _________________.

11. Эмитент осуществляет эмиссию необеспеченных облигаций(без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»), в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 названного Указа.

12. Открытая продажа облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе организатора торговли в соответствии с законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах, валютным законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами организатора торговли.

Открытая продажа облигаций осуществляется после регистрации Проспекта эмиссии облигаций второго выпуска эмитента (далее – проспект эмиссии), заверения настоящего документа и его раскрытия путем размещения на информационных ресурсах эмитента, а также на официальном сайте организатора торговли.

Дата начала размещения облигаций: 1 октября 2018 г.

Дата окончания размещения облигаций: 1 сентября 2023 г.

Покупателями облигаций могут быть физические лица, юридические лица, включая банки, – резиденты и (или) нерезиденты Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Время проведения открытой продажи облигаций – в соответствии с регламентом торгов организатора торговли.

Открытая продажа облигаций приостанавливается в период с даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода до даты выплаты процентного дохода (указаны в таблице пункта 15 настоящего документа). В дату выплаты процентного дохода открытая продажа облигаций возобновляется.

Для покупки облигаций покупатели облигаций могут обратиться в ОАО «АСБ Беларусбанк» (далее – уполномоченный брокер) в его точки обслуживания в течение срока, указанного в настоящем пункте. Перечень точек обслуживания и их режим работы размещен на официальном интернет-сайте уполномоченного брокера (http://belarusbank.by).

13. Срок обращения облигаций – 1824 календарных дня (с 1 октября 2018 г. по 29 сентября 2023 г.).

14. Дата начала погашения облигаций – 29 сентября 2023 г. Для целей погашения облигаций депозитарий эмитента формирует реестр владельцев облигаций на 27 сентября 2023 г.

15. По облигациям предусмотрена выплата постоянного процентного дохода (далее – доход) по ставке в виде фиксированного процента к номинальной стоимости облигации в размере 6,5 процента годовых. Доход по облигации устанавливается на весь срок обращения облигаций.

Доход выплачивается периодически, в даты выплаты дохода, на основании реестра владельцев облигаций, сформированного депозитарием эмитента для целей выплаты дохода:

| № п/п | Период начисления дохода: | | | Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода |
|---|---|---|---|---|
| | начало периода | конец периода, дата выплаты дохода | продолжительность периода, календарных дней | |
| 1 | 02.10.2018 | 31.12.2018 | 91 | 27.12.2018 |
| 2 | 01.01.2019 | 31.03.2019 | 90 | 27.03.2019 |
| 3 | 01.04.2019 | 30.06.2019 | 91 | 26.06.2019 |
| 4 | 01.07.2019 | 30.09.2019 | 92 | 26.09.2019 |
| 5 | 01.10.2019 | 31.12.2019 | 92 | 27.12.2019 |
| 6 | 01.01.2020 | 31.03.2020 | 91 | 27.03.2020 |
| 7 | 01.04.2020 | 30.06.2020 | 91 | 26.06.2020 |
| 8 | 01.07.2020 | 30.09.2020 | 92 | 28.09.2020 |
| 9 | 01.10.2020 | 31.12.2020 | 92 | 29.12.2020 |
| 10 | 01.01.2021 | 31.03.2021 | 90 | 29.03.2021 |
| 11 | 01.04.2021 | 30.06.2021 | 91 | 28.06.2021 |
| 12 | 01.07.2021 | 30.09.2021 | 92 | 28.09.2021 |
| 13 | 01.10.2021 | 31.12.2021 | 92 | 29.12.2021 |
| 14 | 01.01.2022 | 31.03.2022 | 90 | 29.03.2022 |
| 15 | 01.04.2022 | 30.06.2022 | 91 | 28.06.2022 |
| 16 | 01.07.2022 | 30.09.2022 | 92 | 28.09.2022 |
| 17 | 01.10.2022 | 31.12.2022 | 92 | 29.12.2022 |
| 18 | 01.01.2023 | 31.03.2023 | 90 | 29.03.2023 |
| 19 | 01.04.2023 | 30.06.2023 | 91 | 28.06.2023 |
| 20 | 01.07.2023 | 29.09.2023 | 91 | 27.09.2023 |
| | Итого | | 1824 | |

Сумма дохода перечисляется владельцам облигаций в безналичном порядке в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае выплаты дохода в белорусских рублях расчет суммы причитающихся денежных средств осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату выплаты дохода.

16. Эмитент осуществляет досрочное погашение выпуска облигаций либо его части в случае, установленном законодательством Республики Беларусь. Кроме того, эмитент вправе по собственной инициативе осуществить досрочное погашение выпуска облигаций либо его части до даты окончания срока обращения облигаций. Досрочное погашение облигаций осуществляется эмитентом в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, который формируется депозитарием эмитента за 2 рабочих дня до установленной эмитентом даты досрочного погашения облигаций.

Причитающаяся к выплате сумма денежных средств за досрочно погашаемые облигации перечисляется в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на счета владельцев облигаций. В случае досрочного погашения облигаций в белорусских рублях расчет суммы причитающихся денежных средств осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату досрочного погашения облигаций.

17. Эмитент обязуется осуществлять досрочный выкуп облигаций на организованном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах, валютным законодательством Республики Беларусь, локальными правовыми нормативными актами организатора торговли по текущей стоимости облигации в следующие даты: 10 сентября 2019 г., 10 сентября 2020 г., 10 сентября 2021 г., 9 сентября 2022 г., 8 сентября 2023 г.

Владельцы Облигаций вправе требовать досрочного выкупа облигаций только в указанные даты при соблюдении процедуры, определенной в проспекте эмиссии.

Перечисление денежных средств осуществляется в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь и регламентом расчетов организатора торговли в безналичном порядке на счета владельцев облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь.

Кроме того, в период обращения облигаций эмитент имеет право осуществлять досрочный выкуп облигаций на организованном и (или) неорганизованном рынках в иные сроки при достижении договоренности между эмитентом и владельцем(ами) облигаций.

18. При погашении облигаций владельцам облигаций выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иной неполученный доход – при наличии).

Погашение облигаций осуществляется: в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций для целей погашения облигаций, сформированном депозитарием эмитента на дату, указанную в пункте 14 настоящего документа; путем перечисления причитающейся суммы денежных средств в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на счета владельцев облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае погашения облигаций в белорусских рублях расчет суммы причитающихся денежных средств осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату начала погашения облигаций.

19. В случае признания республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг, настоящего выпуска облигаций недействительным, запрещения эмиссии облигаций эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций, а также накопленный по таким облигациям доход, в месячный срок с даты признания выпуска недействительным, запрещения эмиссии облигаций. Все издержки, связанные с признанием выпуска облигаций недействительным, запрещением эмиссии облигаций и возвратом средств владельцам облигаций, относятся на счет эмитента.

20. Сделки с облигациями в процессе обращения осуществляются на организованном и (или) неорганизованном рынках физическими лицами, юридическими лицами, включая банки, – резидентами и (или) нерезидентами Республики Беларусь, а также эмитентом, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах и валютным законодательством Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами организатора торговли.

21. С копией проспекта эмиссии (копией изменений и (или) дополнений в проспект эмиссии – при наличии) можно ознакомиться визуально по адресу, указанному в пункте 2 настоящего документа, а также в точках обслуживания уполномоченного брокера, перечень которых и их режим работы размещены на официальном интернет-сайте уполномоченного брокера (http://belarusbank.by).

Директор
ООО «ПрофитЗерноМаркет» Т. И. Левкович

Главный бухгалтер
ООО «ПрофитЗерноМаркет» Е. А. Гордей

# НА БОЧЦЫ З ПОРАХАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па-першае, горныя работы немагчымыя без выкарыстання выбуховых рэчываў. У Беларусі яны актыўна выкарыстоўваюцца, напрыклад, на мікашэвіцкім «Граніце», віцебскім «Даламіце», шчэбеневым заводзе ў Глушкавічах. Па-другое, незваротна губляўся б каштоўны рэсурс у выглядзе металу. Што асабліва важна для Беларусі, дзе буйных радовішчаў жалезнай руды не выяўлена. І таму быў прыняты курс на ўтылізацыю боепрыпасаў. Гэта значыць, на максімальнае выкарыстанне іх кампанентаў у якасці другаснай сыравіны.

Аб тым, як жа гэта адбываецца, расказаў начальнік аддзела нагляду за бяспекай утылізацыі боепрыпасаў, вырабу і выкарыстання выбуховых матэрыялаў упраўлення нагляду за бяспекай горных і выбуховых работ, металургічных вытворчасцей і ўтылізацыі боепрыпасаў Дзяржпрамнагляду Уладзімір Боеў.



Фота БелТА

**Метал, які застаецца ад снарада, правяраецца. Калі слядоў узрыўчаткі ў ім няма, то яго адпраўляюць на пераплаўку. Як правіла, снарад дае тры тыпы металу — жалеза, медзь і латунь.**

## 10 ТЫСЯЧ ВАГОНАЎ

Старт утылізацыі боепрыпасаў у Беларусі быў дадзены ў 1992 годзе. У сістэме Міністэрства абароны было створана сумеснае беларуска-амерыканска-англійскае прадпрыемства «Белканверс». Яно распачало сваю дзейнасць на тэрыторыі арсеналу пад Добрушам, дзе, па прыблізных падліках, захоўвалася каля 10 тысяч (!) вагонаў боепрыпасаў, у многіх з якіх выйшаў тэрмін прыдатнасці. Работа тут жа набыла істотны камерцыйны размах.

— Напрыклад, адзін кілаграм латуні каштаваў у тыя часы 1,7 долара, — кажа Уладзімір Боеў. — Здавалася, на першы погляд, няшмат. Але сярэдні заробак на прадпрыемствах тады складаў 20—30 долараў. Гільза ў снарадзе калібрам 122 міліметры змяшчае ў сабе 10 кілаграмаў латуні. Толькі за адну змену прадпрыемства магло перапрацаваць 600 снарадаў. Там працавала лінія, якая дазваляла разукамплектаваць артылерыйскія снарады гідрадынамічным метадам. Снарад «раздзіраўся», а выбуховае рэчыва адтуль проста вымывалася. Самае галоўнае, што гэтая трацілавая пульпа не перапрацоўвалася ў прамысловае выбуховае рэчыва, а проста ішла на склад мёртвым грузам. І гэта пры тым, што горназдабыўныя прадпрыемствы былі вымушаны закупляць узрыўчатку за мяжой!

Гісторыя першапраходцаў скончылася ў кастрычніку 1995 года. На прадпрыемстве пачалі асвойваць драбненне трубчастых бяздымных порахаў. Спроба гэтая мела трагічны фінал: здарыўся выбух і — пажар, загінулі чатыры работнікі сумеснага прадпрыемства.

Гэтая аварыя і стала тэмай першага пасяджэння Камісіі па надзвычайных сітуацыях, якое адбылося праз два месяцы. Было прынята рашэнне аб тым, што неабходна распрацаваць Дзяржаўную мэтавую праграму ўтылізацыі звычайных боепрыпасаў. А на ўзбраенне ўзялі досвед Расіі. Справа ў тым, што з-за геастратэгічнага месцазнаходжання ў Беларусі ніколі не было прадпрыемстваў збройнай прамысловасці. Натуральна, адсутнічалі і тэхнічныя нарматыўна-прававыя акты, і лабараторыі па даследаваннях, і навуковыя арганізацыі па распрацоўцы і вывучэнні ўласцівасцяў выбуховых рэчываў. Так у Беларусі і з'явіліся два цэнтры ўтылізацыі боепрыпасаў. Пад Добрушам вытворчасць была перазапушчана праз некалькі гадоў. Другой пляцоўкай стала мясцовасць непадалёк ад Віцебска.

**Гісторыя першапраходцаў скончылася ў кастрычніку 1995 года. На прадпрыемстве пачалі асвойваць драбненне трубчастых бяздымных порахаў. Спроба гэтая мела трагічны фінал: здарыўся выбух і — пажар, загінулі чатыры работнікі сумеснага прадпрыемства.**

Адметна, што новыя боепрыпасы, якія праектуюцца цяпер, робяцца з улікам магчымай утылізацыі іх у будучыні. Стварыць тэхнічную базу з «нуля» ўжо няма патрэбы.

## НА ДАПАМОГУ ПРЫХОДЗІЦЬ ПАРАФІН

У снарадзе ёсць тры віды ўзрыўчаткі. Перапрацаваць з іх можна на сёння толькі два. Па-першае, гэта выбуховае рэчыва ў самім снарадзе. Напрыклад, снарад калібрам 203 міліметры важыць больш за 100 кілаграмаў. Выбуховага рэчыва ў ім — больш за 16. Да таго ж магутнейшага за траціл больш чым у паўтара раза. Па-другое — порах, які выступае ў якасці метальнага зараду. І па-трэцяе, зарад у самім капсулі ці ўзрывальніку. Калі ўдарнік б'е па капсулі, то зарад у ім узрываецца і стварае полымя, якое падпальвае парахавы зарад. Вось гэты самы капсуль пакуль перапрацаваць немагчыма. Таму ён адпраўляецца толькі на знішчэнне.

— Сучасная тэхналогія ўтылізацыі досыць простая, — гаворыць Уладзімір Боеў. — Снарад разрываюць. У сістэму падаецца парафін з высокай тэмпературай, які плавіць траціл. Гэтая маса пераліваецца ў спецыяльны раздзяляльнік. Траціл больш цяжкі за парафін і таму асядае ўнізе. Парафін застаецца зверху і... падаецца на новы цыкл работы. Траціл жа выліваецца ў спецыяльны паддон, дзе ён крышталізуецца. А далей ён ідзе на выраб новай узрыўчаткі.



www.topwar.ru

Метал, які застаецца ад снарада, правяраецца. Калі слядоў узрыўчаткі ў ім няма, то яго адпраўляюць на пераплаўку. Як правіла, снарад дае тры тыпы металу — жалеза, медзь і латунь. Адзінае выключэнне з гэтага правіла — цвердасплаўныя наканечнікі бранябойных снарадаў. Пакуль яны толькі назапашваюцца з-за таго, што няма тэхналогіі па іх перапрацоўцы.

## НАВОШТА ПІЛАВАЦЬ?

Стаўка за парушэнне тэхналагічнага працэсу ў справе перапрацоўкі боепрыпасаў — жыццё. Так, у пачатку нулявых гадоў прагрымеў выбух на заводзе ліцця і нармаляў у Гомелі. Туды на пераплаўку паступілі карпусы былых боепрыпасаў. Нехта недагледзеў, і разам з абясшкоджанымі балванкамі трапіў баявы, неразукамплектаваны снарад. У металургаў жа ёсць свае правіла перад тым, як адпраўляць метал у печ на пераплаўку. У любой ёмістасці павінны быць прасвідраваны дзве дзіркі. Гэта трэба для таго, каб унутры, акрамя металу, нічога не было. Справа ў тым, што ад высокай тэмпературы ў плавільнай печы любое рэчыва расшыраецца і можа справакаваць выбух. Што і адбылося. Загінуў рабочы...

А аднойчы бацька і сын знайшлі невялікую 50-кілаграмовую бомбу, у якой не было ўзрывальніка. Крыху менш за палову вагі гэтай бомбы прыходзілася на траціл. Бацька працаваў зваршчыкам. Невядома чаму яму прыйшла ў галаву думка разрэзаць гэтую бомбу з дапамогай зварачнага апарата. Авантура скончылася трагічна для абодвух.

— А што рабіць са снарадамі часоў вайны, якія і дагэтуль знаходзяць падчас раскопак у нашай краіне?

— Іх можна толькі падрываць на палігонах, — адказвае Уладзімір Боеў. — Тыя снарады вельмі шмат часу праляжалі ў зямлі. І ў іх пайшла карозія элементаў. У якім яны стане, невядома. Асаблівую небяспеку ўяўляюць бомбы, якія ляжаць у зямлі. Калі ўзведзены ўзрывальнік, то любога неасцярожнага дотыку дастаткова, каб яна пасеяла вакол смерць... Знішчэннем такіх выбухованебяспечных прадметаў займаюцца ўнутраныя войскі МУС і інжынерныя войскі Міністэрства абароны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Здарэнні

### КАНФІСКАВАЛІ АРСЕНАЛ ЗБРОІ

**Супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Беларусі канфіскавалі ў віцябчаніна вялікі арсенал зброі і боепрыпасаў да яе, паведамілі ў міліцэйскім ведамстве.**

Інфармацыя пра тое, што мужчына 1986 года нараджэння можа быць датычны да незаконнага абароту зброі і боепрыпасаў, з'явілася ў праваахоўнікаў падчас аператыўнага суправаджэння крымінальнай справы па факце браканьерства ў Аршанскім раёне.

Супрацоўнікі 7-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК пры падтрымцы калег з АМАПа абласнога УУС адначасова блакавалі і правялі вобыскі на шасці аб'ектах нерухомасці падазраванага: у доме пражывання, на дачы, а таксама ў чатырох гаражах. Пералік канфіскаваных забароненых прадметаў аказаўся вельмі вялікі і прымусіў аператыўнікаў задумацца пра сур'ёзнасць намераў іх гаспадара: аўтамат Калашнікава з двума магазінамі, паляўнічая стрэльба «Байкал», пісталет Макарава з магазінам і больш за 300 патронаў да названых відаў зброі, а таксама рэвальвер неўстаноўленага ўзору, пісталет тыпу Макарава з надпісам «сігнальны», дзве ўпакоўкі патронаў траўматычнага дзеяння, арбалет, пнеўматычная зброя, дымавыя шашкі.

Распачата крымінальная справа за незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. У дачыненні да затрыманага абрана мера стрымання ў выглядзе заключэння пад варту. Канфіскаваныя зброя і боепрыпасы накіраваны для правядзення комплексных экспертыз.

Праводзяцца аператыўна-вышуковыя і следчыя мерапрыемствы па ўстанаўленні крыніц паходжання арсенала і магчымых саўдзельнікаў фігуранта ў незаконным абароце зброі. Вядома, што арыштаваны жыхар абласнога цэнтра раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся, дазволу на захоўванне якой-небудзь зброі ён не мае. Звяртае на сябе ўвагу і той факт, што ў карыстанні ў мужчыны знаходзяцца некалькі дарагіх іншамарак, а таксама элітная нерухомасць, кошт якіх істотна перавышае яго афіцыйныя даходы.

### ДВУХ МУЖЧЫН ВЫРАТАВАЛІ СА СКЛЕПА

**Паведамленне пра тое, што ў склепе жылога дома ў вёсцы Касцюкі Любанскага раёна знаходзяцца двое мужчын, паступіла ў МНС ад фельчара брыгады хуткай медыцынскай дапамогі.**

Калі да месца выкліку прыбылі ратавальнікі, у асобным будынку склепа знаходзіліся без прытомнасці два чалавекі — гаспадар дома і яго зяць. Мужчыны былі падняты на паверхню звяном газадымаахоўнай службы МНС. Абодва выратаваныя былі шпіталізаваны ў бальніцу.

Высветлілася, што пацярпелыя разгружалі ўбраны ўраджай з асабістага падворка, спусціўшыся ў склеп, страцілі прытомнасць і самастойна выбрацца не маглі. Гаспадар дома трапіў у рэанімацыю ў цяжкім стане, за яго жыццё змагаліся медыкі, на раніцу стан мужчыны — сярэдняй ступені цяжкасці. Маладога чалавека пасля таго, як ён апрытомнеў, адпусцілі дадому, паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС.

Любанскай брыгадай філіяла «Салігорскгаз» былі зроблены замеры паветра ў склепе, устаноўлена, што ўтрыманне кіслароду ў паветры склала 16 працэнтаў. Ратавальнікі заклікаюць быць асцярожнымі пры рабоце ў замкнёных памяшканнях, скляпах.

### ЗА ЛІНЁЎ І КАРАСЁЎ

**Злоснага браканьера зноў затрымалі з незаконным уловам на вадаёме пад Маладзечнам. 27 кілаграмаў рыбы вылавіў сеткамі на вадаёме каля вёскі Палачаны 45-гадовы жыхар Маладзечанскага раёна. Браканьера затрымалі дзяржінспектары.**

З 40 асобін у незаконным улове — 14 адборных лінёў і 13 асобін рэдкага залатога карася. Па інфармацыі Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, мужчына ўжо неаднаразова пападаўся з забароненымі прыладамі лоўлі і атрымліваў буйныя штрафы. Гэтым разам нанесеная ім шкода склала больш за 4,2 тысячы рублёў. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці затрыманага.

### ЗАСТРЭЛІЛІ ДВУХ ЛАСЁЎ

**Стрэлы ў лесе каля вёскі Кораб'е Столінскага раёна пачулі супрацоўнікі лясгаса і адразу накіраваліся на месца незаконнага палявання.**

Там яны знайшлі здабытага нелегаламі лася. Стралкам удалося знікнуць, аднак у спешцы яны пакінулі мноства ўлік — незарэгістраваную стрэльбу, ліхтар, заплечнік і манок, з дапамогай якога вабілі сахатага.

Да разбору падключыліся супрацоўнікі Столінскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. За 300 метраў ад здабытага лася яны знайшлі яшчэ і параненую самку. Выжыць той не ўдалося. Па факце незаконнага палявання заведзена крымінальная справа. Падазраваныя ўжо маюцца. Прызначаны шэраг неабходных экспертыз.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Дабрачыннасць

# У ДАПАМОГІ ДОЎГАЕ ЖЫЦЦЁ

### Усё больш рэдкіх дзіцячых захворванняў можна вылечыць не выязджаючы за мяжу

**Пацвярджэнне таму — падпісанне чарговых праграм супрацоўніцтва паміж Міністэрствам аховы здароўя і Міжнародным дабрачынным фондам дапамогі дзецям «Шанц». Фонд аказвае матэрыяльную дапамогу сем'ям з хворымі дзецьмі ў тых выпадках, калі з нейкіх прычын лячэнне не можа быць аплачана з бюджэтных сродкаў.**

З «Шанцам» супрацоўнічаюць некалькі дзясяткаў як прыватных кампаній, так і дзяржаўных прадпрыемстваў, ахвяруюць свае сродкі і ўсе ахвотныя. Згодна з падпісанымі пагадненнямі, фонд часова прафінансуе закупку лекавых сродкаў для лячэння запаленчых хвароб кішэчніка ў дзяцей, у прыватнасці язвавых калітаў і хваробы Крона. Як растлумачыла **начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзіцяці галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Людміла ЛЁГКАЯ,** колькасць такіх захворванняў у дзяцей з часам расце. І для працэдуры ўнясення неабходных прэпаратаў у пералік асноўных лекавых сродкаў у Беларусі патрэбны пэўны час. Менавіта на гэты тэрмін фінансаваць іх закупку дапамажа фонд «Шанц», што дазволіць не перарываць лячэнне ў дзяцей, у якіх яно распачата.

Прэпараты, у тым ліку і супрацьпухлінныя, для лячэння рэдкага генетычнага захворвання — туберознага склерозу, таксама будуць унесены ў пералік асноўных лекавых сродкаў, пакуль жа іх будуць набываць дзякуючы «Шанцу». Акрамя гэтага, за сродкі дабрачыннага фонду будзе набыта абсталяванне для хірургічнага лячэння дзяцей з эпілепсіяй.

— Каля 4,5 тысячы дзяцей у Беларусі хварэе на эпілепсію, — расказала Людміла Лёгкая. — Штогод гэты дыягназ ставіцца 600 малым, прычым у 500—550 выпадках — дзецям ранняга ўзросту. У 30 % выпадкаў эпілепсія паддаецца толькі хірургічнаму лячэнню. Набытае абсталяванне дазволіць забяспечыць якасны маніторынг да і пасля аперацыі.

**Кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай нейрахірургіі, галоўны пазаштатны спецыяліст па дзіцячай нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Міхаіл ТАЛАБАЕЎ** расказаў, што за апошні час у Беларусі асвоілі дзевяць прынцыпова новых нейрахірургічных аперацый, і тры з іх — для лячэння эпілепсіі. Новае абсталяванне дазволіць палепшыць дыягностыку гэтай хваробы.

**Міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА** адзначыў, што супрацоўніцтва з Міжнародным дабрачынным фондам дапамогі дзецям «Шанц» спрыяе развіццю цэлых кірункаў у сферы дзіцячай аховы здароўя і дапамагае ўкараніць у айчынныай медыцыне найноўшыя прарыўныя тэхналогіі.

— Выкарыстоўваючы рэсурсы бізнесу, які супрацоўнічае з фондам, у прыватнасці, такіх кампаній, як ААТ «Белгазпрамбанк», ААТ «Газпрам Трансгаз Беларусь» і іншых, мы на працягу ўжо пяці гадоў рэалізуем некалькі праграм, — падкрэсліў Валерый Малашка.

**Старшыня Апякунскага савета фонду, старшыня праўлення ААТ «Белгазпрамбанк» Віктар БАБАРЫКА** падкрэсліў, што партнёрства з «Шанцам» фарміруе правільныя ўзаемаадносіны паміж бізнесам, дзяржавай і тымі, хто мае патрэбу ў дапамозе. Ён адзначыў, што фонду дапамагае вялікая колькасць кампаній, нядаўна далучыліся «Камака» і «Армтэк».

— Памер кампаніі не мае значэння. Любая дапамога пашырае магчымасці «Шанца» выратаваць жыццё і вярнуць здароўе дзецям.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# ЛЕЧАЦЬ ЦІ КАЛЕЧАЦЬ?

## Калі і як трэба выкарыстоўваць антыбіётыкі

**Не сакрэт, што многія з нас пры першых праяўленнях прастуды ці расстройства кішэчніка дастаюць з хатняй аптэчкі антыбіётыкі і пачынаюць лячэнне. Іншыя ж, наадварот, нават пасля назначэння ўрачом гэтых прэпаратаў адмаўляюцца іх прымаць. Пра шкоду і карысць антыбактэрыяльных сродкаў, а таксама пра тое, як да іх ставіцца ў надыходзячы сезон рэспіраторных інфекцый, расказала загадчык аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі Мінска Ірына ЕЎДАКІМАВА.**

***— Ірына Анатолеўна, многія з нас з асцярогай ставяцца да прызначэння антыбіётыкаў, некаторыя нават адмаўляюцца іх прымаць...***

— ...Забываючы пра тое, што да іх адкрыцця на працягу тысячагоддзя галоўнай небяспекай для чалавека былі менавіта інфекцыйныя хваробы, якія перыядычна прымалі маштаб эпідэмій і выкошвалі цэлыя рэгіёны. Смяротнасць ад інфекцый была надзвычай высокая, а чалавек, якому пашчасціла дажыць да 30 гадоў, лічыўся пажылым. Так што адкрыццё антыбіётыкаў у нейкай ступені перавярнула свет. Але сапраўды многія ставяцца да іх насцярожана, і тлумачэнне гэтаму ў самой іх назве. У перакладзе з лацінскай мовы яна, дарэчы, азначае «супраць жыцця». Але зразумела, што іх дзеянне накіравана не супраць чалавека, а супраць мікраарганізмаў, якія пранікаюць у наша цела. Небяспека ў тым, што большасць антыбіётыкаў уплывае не на аднаго ўзбуджальніка, а на цэлыя групы, не толькі на хваробатворныя бактэрыі, але і на тыя, што неабходны для нармальнага функцыянавання арганізма. Напрыклад, у нашым кішэчніку ўтрымліваецца каля 2 кілаграмаў мікробаў, сярод іх пераважная колькасць бактэрый, без якіх функцыянаванне кішэчніка немагчымае. Карысныя бактэрыі прысутнічаюць таксама на скуры, у поласці рота, у похве — усюды, дзе можа адбывацца кантакт арганізма з чужародным для яго асяроддзем.

***— Ужываючы антыбіётыкі, мы іх знішчаем?***

— Розныя групы бактэрый суіснуюць у нашым арганізме ў балансе адзін з адным і з іншымі мікраарганізмамі, у прыватнасці, з грыбамі. Парушэнне гэтага балансу, якое адбываецца пры прыёме антыбактэрыяльных прэпаратаў, вядзе да празмернага росту антаганістаў, тых жа грыбкоў. Так развіваецца дысбактэрыёз — дысбаланс мікраарганізмаў.



***— Якія найбольш частыя негатыўныя праяўленні ад прыёму антыбіётыкаў?***

— Менавіта дысбактэрыёз — адно з самых частых негатыўных наступстваў. Яго праяўленнямі з'яўляюцца грыбковыя інфекцыі, яркі прадстаўнік якіх — вядомая ўсім жанчынам малочніца. Таму разам з антыбіётыкамі звычайна прызначаюць і прэпараты, якія садзейнічаюць аднаўленню мікрафлоры. Важна прымаць іх правільна: не падчас антыбіётыкатэрапіі, а пасля яе.

***— Здараецца, што спачатку прызначаюць адзін антыбіётык, але ён не дапамагае, і ўрач прапісвае іншы — шырокага спектра дзеяння. Чаму нельга адразу ім скарыстацца?***

— Важна ўсведамляць, што чым больш магутны прэпарат вы прымаеце і чым шырэйшы яго спектр дзеяння, тым больш бактэрый загіне. Таму пажадана прымаць антыбіётыкі шырокага спектра дзеяння толькі ў выпадках крайняй неабходнасці, а ва ўсіх астатніх урач падбірае сродак вузкага спектра. Ён аказвае прыцэльны ўплыў толькі на невялікія, «патрэбныя» нам групы бактэрый. Гэта своеасаблівая прафілактыка пры правядзенні антыбіётыкатэрапіі.

***— Акрамя дысбактэрыёзу, у антыбіётыкаў шэраг іншых пабочных дзеянняў. На што найперш негатыўна ўплываюць гэтыя прэпараты?***

— Трэба разумець, што пабочныя эфекты — гэта магчымае, але неабавязковае наступства прыёму антыбіётыкаў. Калі прэпарат прайшоў выпрабаванні і прыняты ў клінічную практыку, гэта азначае: было адназначна і пераканаўча даказана, што яго карысць для большасці людзей значна перавышае магчымую шкоду. Тым не менш усе людзі маюць асаблівасці, рэакцыя кожнага арганізма не лекі абумоўлена сотнямі фактараў, і ёсць пэўная колькасць пацыентаў, чыя рэакцыя на прэпарат з той ці іншай прычыны аказалася негатыўнай. Адной з такіх непажаданых рэакцый з'яўляецца алергія. Яна можа па-рознаму праяўляцца, часцей гэта скурны сып і сверб. Іх выклікаюць розныя антыбіётыкі, але найчасцей цэфаласпарыны, бета-лактаны і пеніцыліны. Таксічна антыбіётыкі ўздзейнічаюць на печань, якая выконвае функцыю ачысткі крыві ад ядаў, і ныркі, якія адказваюць за выводзенне таксінаў з арганізма. Негатыўна ўплываюць на печань, у прыватнасці, антыбіётыкі тэтрацыклінавага рада, а на ныркі — амінагліказіды, поліміксіны і некаторыя з цэфаласпарынаў. Амінагліказіды, дарэчы, могуць выклікаць незваротнае паражэнне слыхавога нерва, што вядзе да глухаты. Пашкоджваць нервовыя структуры таксама могуць фторхіналоны і антыбактэрыяльныя сродкі нітрафуранавага рада. Леваміцэцін аказвае таксічны ўплыў на кроў і эмбрыён.

***— Чаму пры прастудзе нельга самастойна пачынаць лячыцца антыбіётыкамі?***

— Гэтыя прэпараты дзейнічаюць толькі супраць бактэрый. Калі ж у вас вірусная інфекцыя, яны бяссільныя. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, антыбіётык не з'яўляецца ні гарачкапаніжальным, ні абязбольвальным, ні супрацькашлевым сродкам. Высокая тэмпература, кашаль, галаўны, мышачны ці сустаўны боль — гэта толькі сімптомы, якія ўласцівы многім захворванням. Акрамя таго, антыбіётыкі падаўляюць імунітэт, аслабляючы супрацьўленне арганізма. Менавіта з-за ўласцівасці падаўлення імунітэту антыбіётыкатэрапія не павінна быць празмерна доўгай. У той ці іншай ступені імунітэт падаўляе большасць антыбактэрыяльных прэпаратаў, але найбольш негатыўна дзейнічаюць тэтрацыклін і леваміцэцін. Таму ні пры якіх умовах лепш не займацца самалячэннем антыбіётыкамі. Пры бяздумным прымяненні і ігнараванні асаблівасцяў вашага арганізма лекі могуць аказацца горш за хваробу.

***— З сімптомамі расстройства кішэчніка некаторыя таксама змагаюцца пры дапамозе антыбіётыкаў...***

— Як я казала, прыём антыбіётыкаў можа прывесці да дысбактэрыёзу, адным з праяўленняў якога з'яўляецца дыярэя, супраць якой вы якраз змагаецеся. З кішэчныімі расстройствамі антыбіётыкі калі і прымаюцца, то толькі па назначэнні ўрача пасля дакладнага выяўлення ўзбуджальніка.

## Майстар-клас

# Добра бачу, бо харчуюся правільна!

**У Мінску прайшоў незвычайны майстар-клас ад дабрачыннага праекта «Я бачу!». Урач-афтальмолаг, дыетолаг і прафесійны кухар расказалі, як клапаціцца пра здароўе вачэй з дапамогай правільна падабранага рацыёну, і падзяліліся сакрэтамі прыгатавання нескладаных і карысных страў. Майстар-клас стартаваў у межах інфармацыйнай кампаніі «Я бачу ўсё, таму што харчуюся правільна».**

Праект «Я бачу!», які рэалізуюць Беларускі дзіцячы фонд і кампанія velcom, аднавіў сваю дзейнасць пасля перапынку на летнія канікулы ў школах Брэсцкай вобласці. Мабільныя афтальмалагічныя брыгады абследавалі дзяцей у Жабінкаўскім раёне. Пасля гэтага эстафету прыняў Пружанскі раён — тут агляды пройдуць да 28 верасня. А з 1 кастрычніка брыгады ўрачоў-афтальмолагаў працягнуць выезды ў школы Бярозаўскага, Ганцавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў.

— Рэалізуючы гэты праект, мы імкнёмся зрабіць дыягнастычную дапамогу ўрачоў-афтальмолагаў больш даступнай для дзяцей, якія жывуць у сельскай мясцовасці: медыкі прыязджаюць у тыя населеныя пункты, дзе дзеці жывуць і вучацца, — кажа **дырэктар Беларускага дзіцячага фонду Аляксандр ТРУХАН.** — Эфект гэтай дапамогі велізарны, бо чым раней будуць выяўлены парушэнні зроку, тым раней іх можна лячыць і не дапусціць сур'ёзных паталогій. Важнай з'яўляецца і інфармацыйная работа: і дзеці, і дарослыя павінны ведаць, што многіх захворванняў можна пазбегнуць, калі правільна харчавацца і рабіць зарадку для вачэй.

Праект «Я бачу!» рэалізуецца ўжо трэці год запар. За гэты час афтальмалагічныя брыгады абследавалі школьнікаў у Магілёўскай, Гомельскай, а сёлета — і ў Брэсцкай абласцях. Больш за 30 тысяч дзяцей атрымалі неабходную, але раней не заўсёды даступную ім кваліфікаваную дапамогу ўрачоў-афтальмолагаў. У 32,7 % школьнікаў былі выяўлены розныя паталогіі зроку. Больш чым палову гэтых выпадкаў — 54,3 % — складаюць парушэнні, якія ўдалося дыягнаставаць упершыню менавіта дзякуючы абследаванню мабільных брыгад афтальмолагаў. Ужо сёлета на першым этапе праекта «Я бачу!» абследавана 5835 дзяцей з 66 сярэдніх школ Маларыцкага, Камянецкага і Кобрынскага раёнаў.



Скумбрыя, запечаная з садавіной, прыгатаваная ўдзельнікамі майстар-класа.

— У захаванні добрага зроку харчаванне іграе не апошнюю ролю. Незбалансаваны рацыён, недастатковае ўжыванне гароднінь, садавіны, зеляніны, нездаровыя перакусы могуць прывесці да многіх праблем — ад паніжанага тонусу вочнай мышцы і сіндрому сухога вока да парушэнняў у абменных працэсах сятчаткі і іншых сур'ёзных наступстваў, — расказвае **ўрач-афтальмолаг Брэсцкай дзіцячай абласной бальніцы Крысціна БЕЛЯНІЧАВА.**

Дарэчы, карыснымі і неабходнымі для нашых вачэй з'яўляюцца такія прадукты, як рыба, морква, спаржавая фасоля, гарбуз, тварог, арэхі. На майстар-класе прыгатавалі некалькі нескладаных і смачных страў: ад запечанай з гароднінай скумбрыі да гарбузова-тварожнай запяканкі.

■ Прэч стэрэатыпы!

# ВЫХОЎВАЦЬ ЦІ ЛЮБІЦЬ?

## Шчырая размова з вядомым педагогам пра бацькоўскія сумненні і страхі

**«У жыцці вашых дзяцей, на жаль, будзе вельмі шмат людзей, якія паспрабуюць ім яго сапсаваць. І будзе вельмі шмат тых, у каго гэта атрымаецца: сярод іх будуць настаўнікі, выпадковыя знаёмыя, мужы, жонкі, сябры і гэтак далей. Таму прапаную вам стаць адзінымі людзьмі, якія не будуць псаваць дзецям жыццё, падумайце — адзінымі, хто апрыёры будзе на іх баку. Вы можаце з імі пасварыцца, паканфліктаваць, але сядзеце разам, абмяркуеце прычыну і застаняцеся на іх баку ў любой сітуацыі», — падвёў вынікі інтэрактыўнай лекцыі «Свабода ад выхавання. Глыбокая асабістая размова» Дзіма ЗІЦЕР, вядомы педагог-практык з Санкт-Пецярбурга, дырэктар Інстытута нефармальнай адукацыі INO, заснавальнік школы «Апельсін» (школы, дзе няма адзнак), аўтар шматлікіх артыкулаў і кніг па педагогіцы «Свабода ад выхавання», «Любіць нельга выхоўваць», «Аб бессэнсоўнасці выхавання падлеткаў» і іншых, спікер TEDx, папулярны блогер і аўтар канала на YouTube.**

### ПРЫЧЫНА ІСТЭРЫКІ — БУЛАЧКА

У прадмове да адной са сваіх апошніх кніг ён напісаў: «Педагогіка — штука вельмі практычная. Часта мы нават не задумваемся пра тую ці іншую тэму, пакуль у нашым жыцці не ўзнікне нейкая канкрэтная сітуацыя, якая патрабуе ад нас імгненнай рэакцыі або па меншай меры асэнсавання». Тое, чым ён займаецца, Дзіма называе «педагагічнай творчасцю». А вось да слова «выхаванне» ставіцца з вялікай асцярожнасцю, кажа, што яно прыціскае як прэсам да зямлі і не дае падняцца. А насамрэч нічога не трэба рабіць — толькі любіць дзіця.

**«Давайце запытаемся, што яны хочуць на сняданак, і ці насамрэч ім холадна?»**

Дзяцей лічаць самай вялікай групай людзей, якая падвяргаецца дыскрымінацыі (па ўзросце), таму што іх меркаванне бацькоў мала цікавіць. «Вы не заўважалі, што дарослыя часта ставяцца да дзяцей, як да нязручнага аб'екта, які моцна ўскладняе іх бацькоўскае існаванне? — кажа педагог. — Як да назойлівай мухі, ад якой неабходна адбіцца, як да маленькага нягодніка, з якім трэба справіцца любой цаной, і які, у сваю чаргу, толькі і думае, як зрабіць наша жыццё невыносным... Як быццам бы мы — анёлы, якія ўсё разумеюць, а яны — нікчэмныя недаробкі, якіх трэба зрабіць зручнымі для ўласнага карыстання. Ды, зрэшты, і не дзеля карыстання. Так... абы не заміналі».

Нестандартных ці нават правакацыйных думак у Дзімы шмат, асабліва тады, калі разважае пра школу і настаўнікаў. Ён вельмі яркі, харызматычны лектар плюс вопытны псіхолаг, які віртуозна кіруе аўдыторыяй.

— Калі вы тут, значыць, у вас ёсць пытанні. Кажыце шчыра, навошта прыйшлі? Якія адказы жадаеце пачуць? — звярнуўся Дзіма Зіцер да бацькоў, якія суботнім вечарам завіталі на яго лекцыю. І фактычна адразу лекцыя-маналог перайшла ў дыялог.

*«Майму адзінаму сыну дзевяць гадоў. І ў мяне ёсць праблемы. Я кантралюю кожны яго крок: ці з'еў ён суп, чым займаецца і гэтак далей. Я не даю дзіцяці ключы, таму што баюся, што ён іх згубіць...»*

— Як правіла, бацькі якія прыходзяць на сустрэчу, разумеюць, што праблема не ў дзіцяці, а ў іх саміх, і вы з іх ліку, — канстатаваў педагог.

*«Два браты: аднаму дзевяць гадоў, другому — 12. Яны пастаянна паміж сабой канкурыруюць. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што абодва займаюцца каратэ...»*

*«Хлопчыку сем гадоў, яго сястрычцы — чатыры. Старэйшы брат падаўляе сястру, прымушае рабіць тое, што яна не хоча. Баімся, што калі дачка вырасце, то заўсёды будзе падпарадкоўвацца больш моцнаму...»*

*«Як не прымушаць, а натхняць? І як зразумець, што насамрэч хоча дзіця? Да чаго яно цягнецца?»*

Пытанняў у бацькоў шмат, што лішні раз пацвярджае — у праблемных сітуацыях, хоць бы аднойчы, траплялі ўсе.

— У які б горад я ні прыехаў, паўсюдна назіраю наступную карціну: ідзе па вуліцы маці з дзіцем, трымае яго за руку. У другой руцэ ў малога булачка. Раптам тая падае на асфальт... і літаральна на вачах матуля ператвараецца ў дэмана. Як вы лічыце, ці нармальна для пяцігадовага чалавека ўпускаць з рук булачку? — цікавіцца ў бацькоўскай аўдыторыі Дзіма Зіцер. — Згодны, вядома, гэта нармальна. А што ў такім разе адбываецца з бацькамі? Вы кажаце, што гэта некантралюемы гнеў? А давайце крыху зменім уводныя даныя. Тая ж мама ідзе падчас абеду па вуліцы з начальнікам, і той упускае з рук булачку. Як вы думаеце, у яе будзе такая ж рэакцыя? Не? А чаму з дарослымі так нельга сябе паводзіць, а з дзецьмі можна? Чаму мы не лічым патрэбным сябе кантраляваць, калі побач з намі дзіця? Звычайна кажуць, што чалавек знаходзіўся ў стане афекту... Нічога падобнага. Мы шукаем рацыянальнае тлумачэнне і прыдумляем самі для сябе (як вы толькі што) усё новыя тлумачэнні ўласным недарэчным паводзінам: у нас мала грошай, гэта была апошняя булачка ў магазіне, не трэба было мяне раздражняць, быў складаны напружаны дзень і іншыя. А трэба проста заўважыць, што мы адчувалі фізічна напярэдадні нашага прыліву гневу: у нас станавіліся ватнымі рукі і ногі, перасыхала ў роце, ныла паясніца... Заўважыць, каб атрымаць ключ доступу да ўласных цялесных рэакцый. Калі ў вас адкрыўся рот, каб накрычаць на дзіця, спыніцеся хоць на секунду. Усяго адзін секундны ўздых можа разбурыць гэтую рэакцыю. Калі хтосьці кажа, што ён не можа спыніцца, то кажа няпраўду — проста ён не спрабаваў гэта зрабіць. За секунду ты паспяваеш прыгадаць, як на цябе калісьці крычалі за тое ж самае. Паспяваеш зразумець, што не варта псаваць такі цудоўны дзень, не варта псаваць жыццё і дзіцяці, і самому сабе. А яшчэ, калі вы гневаецеся, падыдзіце да люстэрка і паглядзіце на сябе збоку. Я вам урачыста абяцаю, што гэта будзе для вас найлепшай тэрапіяй!

### СПЯВАЦЬ ЦІ МАЛЯВАЦЬ?

— А вось вам яшчэ адна знаёмая сітуацыя, — кажа педагог. — Вы вяртаецеся з прагулкі па парку з дзіцем, накіроўваецеся на абед да бабулі. На выхадзе з парку дзіця раптам кажа: «Мама ці тата, купі мне марожанае». І ўсё, далей педагагічны калапс! Большасць маіх знаёмых у гэты момант як мінімум «завісаюць». А потым пачынаюць прыдумляць, чаму яны не купяць марожанае: ты страціш апетыт, у цябе горла забаліць і іншыя. І падобная сітуацыя: вы гуляеце па парку з каханым чалавекам. Той прыціскаецца да вас і кажа: «Хачу марожанае...» Што вы зробіце? Скажаце яму, што ты потым абедаць не будзеш? А калі маці ідзе ў супермаркет і бярэ з сабой дзіця, чаго яна ад яго чакае? Вы прыйшлі па пакупкі, а яно? Калі малечы тры-чатыры гады, для яго матуля і бацька — гэта багі. Яны робяць пакупку, і я раблю — кладу ў кошык сваё. І раптам нарываюся на жорсткае «не»!

Натуральна, што ў бацькоў узнікла тут жа мноства пытанняў. А ці трэба заўсёды казаць дзіцяці «Так»? Ці больш правільным было б прывучаць да думкі, што ты не заўсёды атрымліваеш у жыцці тое, што хочаш? Няўжо, калі я не куплю марожанае, у мяне сапсуюцца адносіны з малым? Як растлумачыць дзіцяці, што мама не можа скупіць увесь магазін? «Я хачу, каб у маёй дачкі было выхоўваўся густ, каб яна не выбірала зялёныя боцікі пад чырвонае паліто...», — прызналася адна з матуль.

— Для таго каб чалавек навучыўся выбіраць, яму трэба вы-бі-раць! — падкрэслівае Дзіма Зіцер. — І бацькі сваім прыкладам фарміруюць яго густ 24 гадзіны ў суткі. Ёсць такое паняцце, як сямейная культура, і яно да пэўнага моманту — базіснае для дзіцяці. Вашы сын ці дачка кажуць: «Я хачу займацца спевамі...» Бацькі шчаслівыя: іх дзіця будзе спяваць!!! Але праз некалькі заняткаў яны чуюць: «Хачу займацца маляваннем...» Незадаволеныя маці і бацька кажуць: «Мы ўжо заплацілі за тые заняткі». А што насамрэч адбываецца? Дзіця вучыцца вы-бі-раць, яму трэба зразумець самога сябе, да чаго яно імкнецца, што яму бліжэй, што ў яго лепш атрымліваецца. Але вымушана падпарадкоўвацца, і адзіная выснова, якую яно зробіць, — мацнейшы заўсёды мае рацыю. І калі праз некалькі гадоў вы запытаецеся ў яго, а што цікава табе, то можаце пачуць у адказ: «Не ведаю... Калісьці было цікава маляваць, але цяпер я пяю...»

Калі пытаюся ў бацькоў, ці хочуць яны, каб дзіця ўмела адрозніваць голад ад сытасці, усе адказваюць: вядома, хочам. І тут жа прымушаюць яго даядаць суп. «Ці хочаце вы, каб у дзіцяці было ўсё добра з тэрмарэгуляцыяй?» — «Ты што, дурань, вядома, хочам». І тут жа надзяваюць на яго шапку. Ці можна хадзіць зімой без шапкі? Канешне, асабліва калі ты сам разумееш, што табе не холадна...



Дзіма ЗІЦЕР: «Калі ў вас адкрыўся рот, каб накрычаць на дзіця, спыніцеся хоць на секунду...»

Жыццё дзіцяці не павінна складацца толькі з адмоў бацькоў. Чалавек, які расце ў парадыгме «можна», здольны бачыць, чуць і разумець. Ён здольны сказаць «магу, але не хачу» і наадварот «хачу, але зараз не варта». І калі вы скажаце дзіцяці «не», то гэта будзе пачута, магчыма, без задавальнення, але і без скандалаў.

### НА ВОЛЮ!

— Калі я кажу пра свабоду ад выхавання, то ўсе звычайна думаюць, што я маю на ўвазе дзяцей. А я кажу пра дарослых! Гэта мы знаходзімся ў палоне ў выхавання, — падкрэслівае педагог. — Я з'яўляюся бацькам трох дачок. Адной з іх 15 гадоў. Яна паабяцала вярнуцца дамоў аб 11-й гадзіне. Але ў пятнаццаць хвілін дванаццатай, а палове дванаццатай яе няма. Як сапраўдная Папялушка, з'яўляецца апоўначы. Ды яшчэ і ў выдатным настроі. За гэту гадзіну ты паспяваеш пракруціць у сваёй галаве ўсе самыя страшныя варыянты, што з ёй магло здарыцца. Але, увага! Гэта мой страх, і мне з ім разбірацца, а не ёй. Гэта частка майго бацькоўства. Я лічу правільным расказаць дачцэ пра свае страхі, калі яна вяртаецца позна, пра тое, што мне некамфортна ў стане, калі ў мяне а палове дванаццатай трасуцца рукі.

Напрыклад, можна дамовіцца аб sms з двух бакоў. У мяне, як у таты, безумоўна, ёсць права яе чакаць, хвалявацца і баяцца. Толькі з гэтага не вынікае, што калі дзіця прыходзіць дадому ў добрым настроі, першае, што яно атрымлівае, — разбурэнне гэтага настрою. А менавіта так і адбываецца раз за разам у падобных сітуацыях. Мы кідаемся на сваіх дзяцей!

Бацькі пацікавіліся меркаваннем педагога наконт бацькоўскага кантролю за інтэрнэтам і смартфонамі.

**«Для таго каб чалавек навучыўся выбіраць, яму трэба вы-бі-раць! І бацькі сваім прыкладам фарміруюць яго густ 24 гадзіны ў суткі».**

— Мая вам парада — ніколі гэтага не рабіце, бо калі дзіця даведаецца пра вашы спробы яго кантраляваць, то вы больш ніколі і нічога пра яго не даведаецеся. Кажу як ёсць: хочаце рызыкаваць — рызыкуйце, але мой абавязак — вас пра гэта папярэдзіць, — шчыра кажа Дзіма. — Гэта тое ж самае, што чытаць асабісты дзённік. Дарослых, як правіла, хвалюе, што ў інтэрнэце іх дзяцей падсцерагае небяспека ў выглядзе груп, накшталт сініх кітоў, педафілаў і парнаграфіі. Дык вось што я вам скажу: на сённяшні дзень няма ніводнага дзіцяці, якое зможа вырасці, не ўбачыўшы парнасайта. Чаму гэта цалкам выключана? А таму, што такі кантэнт лёгка даступны, таму, што падлетку гэта цікава і дае адказы на яго шматлікія пытанні. Нават калі мы з вамі ўвядзем усе бацькоўскія кантролі на свеце, адключым інтэрнэт, перарэжам правады, уберагчы дзяцей усё роўна не зможам. Той жа тэлефон аднакласніка за пару хвілін задаволіць любую цікаўнасць, прычым атрыманая інфармацыя будзе зусім не такой, як бы нам хацелася — і па форме, і па змесце, таму лепш сваё дзіця загадзя падрыхтаваць да такой сустрэчы. І пра секс, і пра парнаграфію, і пра наша стаўленне да іх дзеці павінны даведвацца ад нас.

«Мы часта думаем, што выхаванне — гэта работа, неабходнасць кантраляваць, забараняць, вучыць, выпраўляць, як нам падаецца, — жыць жыццём свайго дзіцяці. А навошта? Давайце паглядзім на дзяцей як на самастойных людзей. Запытаемся, што яны хочуць на сняданак, і ці насамрэч ім холадна? І тады для нас стане неверагоднай радасцю назіраць за тым, як яны растуць, як вучацца, як самі завязваюць шнуркі, як выбіраюць, што ім падабаецца есці, насіць, чытаць, — напісаў у сваёй кнізе «Любіць нельга выхоўваць» Дзіма Зіцер. — Як шкада прапусціць самае цікавае ў жыцці нашых дзяцей з прычыны навязанага нам правіла пастаянна кіраваць. Так шмат праходзіць міма з-за таго, што мы вымушаны іграць ролю выхавацеля замест таго, каб проста любіць. Гадаваць — значыць не адмаўляць сабе ў вялікім задавальненні назіраць за працэсам. Я ўпэўнены: **гадаваць — бацькоўская свабода і радасць, выхоўваць — бацькоўская турма. Дык, можа, на волю?»**

Надзея НІКАЛАЕВА ■

# КАЛЯ ШАСЦІ ТЫСЯЧ ВАЛАНЦЁРАЎ

**Менавіта такую колькасць добраахвотных работнікаў плануецца задзейнічаць падчас II Еўрапейскіх гульняў**

**А яшчэ падчас гульняў будзе працаваць адзіны кругласутачны кол-цэнтр для турыстаў, паведаміў намеснік міністра спорту і турызму Міхаіл ПАРТНОЙ у прэс-цэнтры БелТА.**

У найбліжэйшы час нас чакае важны экзамен — 21 чэрвеня наступнага года наша краіна прымае гэта грандыёзнае спартыўнае свята. Для гасцей і балельшчыкаў распрацоўць спецыяльныя турыстычныя пакеты, якія будуць уключаць білеты на спартыўныя спаборніцтвы, пражыванне ў гатэлях, аграсядзібах, экскурсійную праграму, сувеніры і падарункі, адзіны праязны дакумент на ўсе віды грамадскага транспарту.

### Відэаролік пра патэнцыял сталіцы

Зараз ідзе набор валанцёраў, якія будуць кансультаваць турыстаў на вуліцах горада і культурных аб'ектах, а таксама дапамагаць у пунктах пропуску асобам, якія перасякаюць мяжу краіны. Яны будуць дапамагаць гасцям і пры запаўненні міграцыйных картаў, мытных дэкларацый. У мабільнай праграме «Мінск. Minsk» дапрацоўваецца раздзел аб II Еўрапейскіх гульнях. Пра гульні, якія адбудуцца, актыўна расказваецца на міжнародных турыстычных выстаўках.

Акрамя таго, будзе зняты відэаролік пра турыстычны патэнцыял Мінска і пра будучыя гульні, яго будуць дэманстраваць на бартах самалётаў авіякампаніі Etihad Airways. На час II Еўрапейскіх гульняў будзе забяспечана работа без выхадных магазінаў і аб'ектаў грамадскага харчавання, музеяў і іншых устаноў культуры, пашырана сетка гандлёвых аб'ектаў, якія працуюць у сістэме tax free.

Гэтая работа вядзецца і ва ўвязцы з падрыхтоўкай да правядзення чэмпіянату свету па хакеі, які ў 2021 годзе прымуць Беларусь і Латвія.



Фота БелТА.

### Рост — амаль 18 працэнтаў

Міністэрства і тураператары прагназуюць, што па выніках гэтага года рынак турыстычных паслуг пакажа рост у параўнанні з мінулымі гадамі. Такі прагноз робіцца з улікам работы па лібералізацыі візавага рэжыму, пашырэнню межаў бязвізавых зон Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а таксама актывізацыі маркетынгавых мерапрыемстваў.

Наша краіна за сем месяцаў года павялічыла экспарт турыстычных паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 17,5 % — да 126,1 мільёна долараў. З пачатку года Мінспорту з грамадскімі арганізацыямі і бізнесам правяло больш за 20 маркетынгавых мерапрыемстваў у Еўропе, ЗША, Азіі. Праведзены прэзентацыі турыстычных магчымасцяў нашай краіны на выстаўках у Літве, Латвіі, Эстоніі, Украіне і Расіі.

Сёлета з 27 ліпеня працягласць бязвізавага знаходжання на тэрыторыі нашай краіны павялічана з 5 да 30 сутак. За гэты час паток бязвізавых турыстаў вырас на 42 %. Лідзіруюць па колькасці бязвізавых наведванняў грамадзяне Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Італіі і ЗША.

Чакаецца, што падаўжэнне тэрміну бязвізавага знаходжання замежных грамадзян на тэрыторыі краіны будзе асабліва станоўча адбівацца на дзейнасці санаторна-курортных устаноў нашай краіны. Для курса аздараўлення трэба 8—12 працэдур, а пяцідзённы «бязвіз» не дазваляў гэтага рабіць.

### Пакуль тысячы, а могуць — мільёны

Гэты год аб'яўлены годам турызму Беларусі ў Кітаі. З 10 жніўня дзейнічае ўзаемны бязвізавы ўезд для ўладальнікаў агульнаграмадзянскіх пашпартоў грамадзян нашых краін. Для прыцягнення турыстаў з КНР праводзяцца азнаямленчыя туры для кітайскіх СМІ, сродкі размяшчэння адаптуюцца да стандарту абслугоўвання China Friendly, рыхтуюцца гіды-перакладчыкі з веданнем кітайскай мовы, выдаюцца рэкламна-інфармацыйныя матэрыялы і паляпшаецца навігацыя ў Мінску і рэгіёнах на кітайскай мове.

У сувязі з гэтым Мінспорту разлічвае на штогадовы рост колькасці турыстаў з Кітая не менш чым на 15 % з улікам увядзення бязвізавага рэжыму.

«Усё будзе залежаць ад таго, наколькі добра мы папрацуем па маркетынгавай праграме і якія сродкі будуць вылучаны. Калі па ўсіх буйных рэгіёнах нам выдзеляць сродкі — гэта будзе адзін прырост. Калі будзем прасоўвацца, як і цяпер, невялікімі грашыма, — гэта будзе ў год 12—15 %. Але спадзяёмся ўсё ж такі спрацаваць па павелічэнні турыстычнага прыбытку ў разы», — адзначыў намеснік міністра.

Кітай для нашай краіны вельмі перспектыўны і мэтавы рынак. Па выніках мінулага года колькасць арганізаваных турыстаў з КНР у Беларусі павялічылася ў 2,1 раза. З пачатку года да нас прыехала больш за 17 тысяч грамадзян Кітая (прырост на 4,6 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года).

Па прагнозах экспертаў, усе раней праведзеныя мерапрыемствы па прыцягненні турыстаў з Кітая спрацуюць на максімуме праз год-паўтара. У тым ліку чакаецца рост індывідуальных турыстаў. Па словах Міхаіла Партноя, у першую чаргу кітайцаў цікавяць у нашай краіне «чырвоны турызм» (наведванне мясцін, звязаных з камуністычнай гісторыяй), «лінія Сталіна», а таксама замкі і прырода.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Бабруйск — горад, які чытае

**Прыемная навіна! Учора ў Бабруйску па вуліцы Гарэліка, 51 адкрылася новая крама сеткі ААТ «Белкніга». Адкрывалі новую кнігарню кіраўнікі горада і «Белкнігі» і намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі.**

Першая крама прадпрыемства, на вуліцы Сацыялістычнай, запрацавала ў горадзе яшчэ ў лютым. Прыемна паведаміць, што па плошчы новая гандлёвая пляцоўка амаль удвая больш за папярэднюю — 145 квадратных метраў. На ёй прадстаўлена больш за 15 тысяч найменняў кніжнай і іншай папяровай прадукцыі, канцылярскіх тавараў. Для абслугоўвання павільёна і яго пакупнікоў створана сем рабочых месцаў. Павіншаваць бабруйчан з прыемнай падзеяй завіталі першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Бузоўскі, прадстаўнікі дзяржструктур, беларускіх выдавецтваў і СМІ.

— Гэта вельмі значны і сімвалічны момант у жыцці горада і наогул краіны, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА.** — У наш век інфармацыйных тэхналогій вельмі важна, каб не гублялася роля друкаванай кнігі, каб яна па-ранейшаму заставалася жаданай і чаканай у кожным доме, у кожнай сям'і. Менавіта кніга дапамагае выхоўваць новае пакаленне беларусаў — гарманічна развітых прадстаўнікоў нашага грамадства.

Дарэчы, крама ў Бабруйску стала 88-м буйным гандлёвым павільёнам «Белкнігі» ў Беларусі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Тэрыторыя аздараўлення

# Санаторыі падлічылі прыбыткі

**Сёлетнім летам беларускія санаторыі былі запоўнены цалкам. З пачатку года ў іх адпачыла 465 тысяч чалавек, у тым ліку 175 тысяч гасцей з замежжа. Пуцёўкі на Новы год у большасці беларускіх здраўніц таксама ўжо выкуплены, а месцаў на кастрычнік і лістапад засталося няшмат — каля 20—30 %. Падвёў вынікі летняй аздараўленчай кампаніі і расказаў аб перспектывах восеньскага адпачынку дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

### ПА ЗАЯЎЛЯЛЬНЫМ ПРЫНЦЫПЕ

Асаблівасцю сёлетняй летняй дзіцячай аздараўленчай кампаніі стала тое, што адпачыць маглі ўсе ахвотныя, дастаткова было толькі звярнуцца па пуцёўку. У выніку ў дзіцячых летніках пабывала больш за 381 тысячу школьнікаў — на 13,5 тысячы больш, чым летась.

— Сёлета мы адышлі ад планаў і працавалі па заяўляльным прынцыпе, каб максімальна ахапіць усіх ахвотных, — кажа Генадзь Балбатоўскі. — І мы не памыліліся, бо ў выніку летам у краіне працавала 6 250 лагераў — на 150 больш, чым летась. Як бачна, папулярнасць такога адпачынку толькі расце.

Генадзь Балбатоўскі паведаміў, што на дзіцячае аздараўленне сёлета было накіравана 43 мільёны рублёў — на 3,5 мільёна больш, чым летась. На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы стацыянарных лагераў, а іх у Беларусі 147, з розных крыніц паступіла 11 мільёнаў рублёў.

Пуцёўка на 18 дзён у дзіцячы летнік з кругласутачным знаходжаннем каштавала сёлета ў сярэднім 428 рублёў (частку гэтай сумы пакрывалі бюджэтныя сродкі, яшчэ частку — прафсаюзныя арганізацыі). У параўнанні з мінулым годам цана вырасла нязначна — не больш, чым на 5 %.

— Асаблівую ўвагу мы ўдзялілі аздараўленню дзяцей-сірот — больш за 13,5 тысячы такіх адпачылі ў лагерах, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі. — Пабывала ў дзіцячых санаторыях і аздараўленча-рэабілітацыйных цэнтрах больш за чатыры тысячы дзяцей-інвалідаў.

Дарэчы, у Беларусі працуе сем дзіцячых санаторыяў і 12 рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў, дзе адпачываюць і папраўляюць здароўе пераважна беларускія дзеці за бюджэтныя сродкі.

### ПОПЫТ РАСЦЕ

Летам беларускія здраўніцы былі запоўнены на 100 %, а з пачатку года гэта лічба складала 80 %.

— Па выніках 9 месяцаў мы назіраем устойлівы попыт на санаторна-аздараўленчыя паслугі, у тым ліку на пуцёўкі, што знаходзяцца ў свабоднай рэалізацыі, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі. — Выручка ад іх продажу сёлета вырасла на 20 % і склала 322 мільёны рублёў.

Замежныя грамадзяне купілі пуцёўкі на 146 мільёнаў рублёў. З пачатку года ў беларускіх санаторыях адпачыла 175 тысяч гасцей з замежжа. Пераважна гэта блізкія суседзі — 90 % адпачывальнікаў-замежнікаў складаюць расіяне. Але з-за спрашчэння візавага рэжыму расце ў беларускіх санаторыях колькасць адпачывальнікаў з Прыбалтыкі, Польшчы і Германіі. Найбольшай папулярнасцю ў іх карыстаюцца санаторыі «Юнацтва», «Альфа-Радон» і «Пліса». Супрацоўнікі гэтых здраўніц, дарэчы, актыўна асвойваюць замежныя мовы — такая магчымасць з'явілася на адпаведных курсах у інстытуце турызму.


www.travel.oizy.by

Сярэдні кошт ложка-месца ў стандартным двухмесным нумары за суткі складаў гэтым летам 53 рублі. У параўнанні са снежнем мінулага года ён вырас на 3,5 % (51 рубель). Калі пуцёўка рэалізоўвалася праз Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, сярэдні кошт пражывання ў суткі складаў 34 рублі.

— Ва ўмовах зніжэння попыту ў асеннія і зімовыя месяцы мы прагназуем зніжэнне гэтага кошту ў IV квартале, — паведаміў Генадзь Балбатоўскі. — Глыбіня продажу пуцёвак сёння складае два месяцы. Месцы на Новы год у большасці санаторыяў ужо выкуплены. На кастрычнік забраніравана і рэалізавана 80 % пуцёвак, на лістапад — 70 %. Ёсць усе падставы меркаваць, што сёлета эфектыўнасць работы санаторна-курортнай сістэмы будзе вышэйшая, чым летась.

**Алена КРАВЕЦ** ■

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Таіса Сямёнава — ветэран беларускай журналістыкі, шмат гадоў аддала рабоце ў газеце «Астравецкая праўда». Гэта толькі чалавеку недасведчанаму можа падацца, што ў раёнках праца не мітуслівая, спакойная, накідае шмат вольнага часу. Той жа, хто на практыцы паспытаў яе смак, ведае, што на самай справе — усё наадварот, і чалавеку творчаму нават у выхадныя дні бывае не да ўласных літаратурных практыкаванняў.**

**Можа, таму першая кніжка Таісы Сямёнавай «Дравясёлкі» пабачыла свет толькі летась, і ўвайшлі ў яе як апавяданні, так і вершы — найлепшае з таго, што напісалася за даволі працяглы перыяд. Дарэчы, два апавяданні, што трапілі ў кнігу, у свой час друкаваліся ў «Звяздзе», і адно з іх у 2007 годзе заняло ў нашым конкурсе першае месца.**

**Алесь БАДАК.**

Таіса СЯМЁНАВА

# МАТЧЫН ГРЭХ

ПАЛАТА рыхтавалася да абходу. Жанчыны пераапраналіся, прычэсваліся. Некаторыя нават лёгкі макіяж накладвалі, каб прывабна выглядаць перад дактарам. Валянціна Пятроўна ў гэтай мітусні не ўдзельнічала, ляжала, адвярнуўшыся да сцяны, накрыўшыся коўдрай да самых вачэй. Бо ведала, што будзе далей: павязуць на аперацыю, з якой яна... Не, пра гэта лепш не думаць. Што Бог дасць. Вось толькі Наташка, дачушка... Што будзе з ёю, калі мамы не стане? Забяруць у дзіцячы дом. Валасы густыя і доўгія, абстрыгуць — хто захоча важдацца з дачушчынай касой-красой?

Абследаванне ў анколагаў Валянціна Пятроўна адкладвала да канікулаў, каб адправіць малую ў летнік. Дзяўчынка адпачне, сіл набярэцца. А яна тым часам з'ездзіць ды праверыцца, што там у яе не так.

Зрэшты, жанчына даўно здагадвалася, што іменна «не так». Сем гадоў таму памерла ад раку яе маці, Надзея Міронаўна. Нядоўга пражыла пасля аперацыі. І калі ў самой пачаліся нелады па жаночай частцы, Валянціна Пятроўна зразумела: паўтарае матчын лёс...

* * *

Маці пакрыўдзіла прырода, выправіўшы ў свет непрыгожай. Радня недаўмявала: чаму? У сям'і ўсе былі прывабныя. Бацькі — пара на падбор, стой і любуйся. Два браты статныя, асілкі, старэйшая сястра мілавідная, фігурыстая. А наймяншая, Надзейка, таўставатая, прыземістая, з рэдкімі рудаватымі валасамі. Твар псавалі рабаціннне, масіўны нос і маленькія вочы. «Вылітая Тэкля», — уздыхалі сваякі ды суседзі. Тэкля была бацькава цётка, старая дзеўка, злая ды сварлівая. У вёсцы яе не любілі.

«Ну чаму я такая страшная?» — часам, пагладаючы ў люстэрка, пыталася Надзя немаведама ў каго. У школе яе дражнілі дзеці, ды і ў сваім двары яна бавілася часцей адна. Зрэшты, пазней аднасінныя аднакласнікаў пацяплелі. Надзейка вучылася выдатна, упэўнена ішла на залаты медаль, таму сябравалі з ёю палічыўшыся выгадным — дасць спісаць дамашняе заданне, растлумачыць незразумелае граматычнае правіла. А на кантрольных рэшыць свой варыянт і перадасць іншым. Любімыя прадметы — хімія з біялогіяй, тут Надзейцы не было роўных ні ў школе, ні на раённых алімпіядах. Выбар шляху адбыўся сам сабой — паступіла ва ўніверсітэт на хіміка-біялагічны факультэт.

Студэнцкае жыццё бруіла, але неяк усё міма. На вечарынках Надзя звычайна сядзела незаўважанай. Аднойчы выйшла ў кола на агульны хуткі танец, злавіла некалькі пагардлівых позіркаў. Пачула: «Ну і пачвара!» і кінулася прэч з залы...

Далей была толькі вучоба, вядома, выдатная, на чырвоны дыплом. Надзеі прапанавалі застацца на кафедры, паступаць у аспірантуру, а яна адмовілася: «Хачу працаваць у сельскай школе». Ну, хочаш — дык едзь, працуй.

Здачу апошняга экзамену ўсёй групай «замочвалі» ў хлапечым пакоі інтэрната. Надзя дагэтуль амаль не каштавала спіртнога, а тут — надзвычай смачная, духмяная хатняя налівачка, садавіна, шакаладныя цукеркі. І яна расслабілася. «А мае аднакурснікі, здаецца, зусім неблагія людзі. Чаму я іх цуралася?» — думала і весела смяялася разам з імі. Здаецца, на яе зацікаўлена паглядвае першы прыгажун курса Ігар. Усе пяць гадоў не заўважаў, а тут... Яна ж тайна сохла па ім з таго дня, як убачыла ў аўдыторыі...

Надзея не заўважыла, як усе паразыходзіліся. Чамусьці пагасла святло. Дужыя рукі Ігара абдымалі яе за плечы, расшпілілі сукенку і гладзілі пругкія дзявочыя грудзі, гарачы пацалунак перахапіў дыханне. Было горача і балюча... Прачнулася яна ад яркіх сонечных промняў, голая, на чужой пасцелі. Побач спаў Ігар. На суседнім ложку таксама ляжала пара. У яе граху-сораму былі сведкі...

Потым усё панеслася, як у калейдаскопе. Уручэнне дыпломаў, пажаданні дэкана на добры шлях... Надзея не схацела браць адрасы цяпер ужо былых аднакурснікаў і не засталася на выпускны. Вячэрнім цягніком паехала дадому. Адпачывала, ад'ядалася, купляла абновы. Бацькі далі грошай, бо як жа настаўніца будзе хадзіць на ўрокі ў студэнцкіх уборах? Прайшоў месяц, і яна зразумела, што цяжарная. Нікому нічога не сказаўшы, прыспешыла ад'езд на будучае месца працы.

З начальствам ды калегамі Надзеі пашанцавала: прынялі цёпла, уладкавалі на кватэру да добрай, спагадлівай жанчыны. Як маці аднеслася да яе, як бабуля — да народжанай дачушкі. Бацькі ж ад Надзеі адракліся: зняславіла сям'ю, байстручку нарадзіла... Так і не прыехалі адведаць унучку. Імя малой дала матчына — Валянціна, але не растапіла лёд іх сэрцаў.

З часам калгас выдзеліў маладой маці з дачушкай невялікі спраўны дамок. Гараджанка Надзея аказалася сялянкай у душы — з ахвотай працавала на зямлі, хутка давяла да ладу агарод, двор і кветнік. Словам, стала маладая настаўніца ў вёсцы сваёй. А як палюбілі яе дзеці! За справядлівыя адзнакі, цікавыя ўрокі, экскурсіі на прыроду, працу на доследным прышкольным участку, які неўзабаве стаў найлепшым у раёне..

Валечка тым часам падрастала, асабліва не хварэла. Прастуджвалася часам, не без таго, але названая бабуля ставіла малой гарчычнікі, паіла чаем з малінай, малаком з мёдам, і дзяўчынка хутка папраўлялася..

Надзея Міронаўна адчувала сябе шчаслівай. Жаданае мацярынства, любімая праца, запоўненае цікавымі справамі жыццё. Што яшчэ трэба? Раманы? Кіньце вы! Настаўніцкі калектыў у школе збольшага жаночы, толькі дырэктар ды фізрук — мужчыны, абодва добрыя сем'яніны. А па курортах-санаторыях яна не ездзіла, не было патрэбы...

* * *

Валя скончыла школу, універсітэт, вярнулася ў родную школу выкладаць гісторыю з геаграфіяй. Адна, без пары. І гэта вельмі трывожыла Надзею Міронаўну. Няхай сабе дачка не пісаная прыгажуня, усяе красы — густыя каштанавыя валасы, але ж працавітая, акуратыстка, характар — золата. І жыццёвай мудрасцю Бог не абдзяліў. Нават старэйшыя калегі парады просяць. А каханага побач не назіраецца. Чаму?

— Давай, дачушка, гарбаты пап'ём, — Надзея Міронаўна адарвалася ад тэлевізара і пайшла на кухню, уключыла электрачайнік, падрыхтавала заварку, дастала з буфета вазачку з пячэннем. Абдумвала, як зноў загаварыць аб патаемным і балючым. Бывала, пачне размову, а Валя падыдзе, абдыме, у шчаку цмокне, нешта смешнае скажа і сур'ёзнасць моманту знікне. А потым зноў доўга не надыходзіць сон...

Надзея Міронаўна спакваля прывучала сябе да думкі, што дачка застанецца бязмужняй. Дык хоць бы дзіцятка нарадзіла. Памагла б гадаваць, пакуль... Вось пра гэтае «пакуль» нарэшце трэба неяк сказаць...

Пацягнула тонкім водарам цудоўна заваранай гарбаты. Валянціна адкілала ўбок таўсценную кнігу — няхай вочы адпачнуць. А чаёк мо санлівасць прагоніць. Ды і любіла яна такія кухонныя пасядзелкі з матуляй. Пра ўсё-усенькае перагаворыць, паўспамінаюць... Але цяпер нечаму стала трывожна.

— Як добра было б, каб разам з намі зараз сядзелі ўнук ці ўнучачка. Я б пірог які спякла ці торцік...

— Ой, мама, не пачынай, калі ласка. Не суджана мне, відаць, быць у пары. А несур'ёзных адносін я не хачу. Толькі сораму набярэшся...

І зноў тэма была закрыта. Пабедаміць дачцэ, што на тым тыдні сказаў ёй урач-анколаг у раённай паліклініцы, Надзея Міронаўна так і не адважылася.

Надышло лета, у школе распачаўся вялікі рамонт. У некаторых кабінетах спатрэбілася памяняць праводку. Дырэктар выклікаў спецыялістаў з раённых электрасетак. З брыгадай манцёраў прыбыў майстар — сімпатычны чарнявы хлопец Раман. Надзея Міронаўна пазнала яго — вучыўся тут, хоць і не ў яе класе. Павіталіся. Хлопец расказаў, што пасля службы ў войску скончыў электратэхнікум, паступіў завочна ў інстытут.

— Жанаты?

— Пакуль не, — усміхнуўся. — Нарачоная дыплом абароніць, на працу ўладкуецца, а там і вяселле згуляем. Ды вы яе ведаеце — Галечку, аднакласніцу маю.

Надзея Міронаўна адразу ўспомніла бялявую блакітнавокую прыгажуню, выдатніцу, гонар школы. Гожая будзе пара — падумала. І — вырашыла ўзяць на душу грэх. У наступны прыезд паклікала Рамана ў настаўніцкую і, шчыльна прычыніўшы дзверы, сказала:

— Рома, закруці ты любоў з маёй Валянцінай. Ненадоўга. Каб толькі зацяжарыла яна...

— Аб чым вы, Надзея Міронаўна? Я Галінку моцна кахаю, не хачу страціць. Яна не даруе мне здрады...

— А ты не кажы. Адкуль яна даведаецца?

— Не змагу. Мы нічога не ўтойваем адно ад аднаго. Ды і падласцю гэта будзе з майго боку.

Настаўніца памаўчала ў задуменні, а потым вымавіла:

— Рак у мяне, Рома. Нядоўга працягну. Валянціна застанецца зусім адна. Хай было б у яе дзіцятка... Калі здарыцца ў вас з Галінкай разлад, прыбягу, растлумачу ёй усё, на калені ўпаду, каб даравала табе...

Электраправодку, разеткі і выключальнікі ў кабінеце гісторыі Раман мяняў сам. Разгаварыліся з Валянцінай, успаміналі школьныя гады, смяяліся. Вызваўся правесці яе дадому. На другі дзень напрасіўся на каву. Валянціна крыху сумелася: маці паехала ў суседнюю вёску праведаць хворую калегу, магчыма, заначуе ў яе. Няёмка гасцей запрашаць. Ды ладна, Рома ж амаль аднакласнік...

Да духмянай, цудоўна заваранай кавы Валя дадала каньяку — у шафцы знайшлася раскаркаваная бутэлька. Потым пакарміла госця вячэрай, і ён застаўся да раніцы...

Праз тыдзень электрыкі скончылі свае справы і з'ехалі. Раман — таксама. А Валянціне нечакана прапанавалі «гарачую» пуцёўку ў дом адпачынку. Адтуль яна вярнулася адпачыўшая, загарэлая і... цяжарная.

Надзеі Міронаўне зрабілі аперацыю, правялі ўсе неабходныя працэдуры, але праз тры гады здарыўся рэцыдыў. Валянціна засталася адна, з маленькай Наташкай на руках. Зараз дачушцы дзесяць, адпачывае сабе ў летніку. А яна ляжыць у «ракавай» палаце і чакае прысуду ўрачоў. І ведае ён: будзе — смерць...

* * *

На абходзе Валянціне сказалі, што аперацыя прызначана на заўтрашнюю раніцу. А сёння трэба адпачываць і — сустракаць гасцей.

— Якіх гасцей? Я нікога не чакаю.

— Валянціна Ігараўна, да вас прыехалі родзічы, — аб'явіла, зазірнуўшы ў палату, маладзенькая медсястрычка. — Сустракайце.

Дзверы адчыніліся, і ў палату ўвайшла... Галя. За ёю нясмела прасунуўся Раман. У Валянціны перахапіла дыханне, з вачэй пырснулі слёзы. Яна хапала ротам паветра і не магла прамовіць ні слова. Суседкі, адчуўшы няёмкасць сітуацыі, адна за адной рэціраваліся з палаты.

— Мы даведаліся, што цябе рыхтуюць да аперацыі, і прыехалі падтрымаць, суцешыць, каб не баялася, — Галя першая апраўілася ад збянтэжанасці і загаварыла. — Гасцінцаў хатніх прывезлі. За Наташку не хвалюйся, яна ў нас. У лагеры моцна пасябравала з нашай Таццянкай, і тая запрасіла яе ў госці. Рома ўчора прывёз абедзвюх.

Валянціна, хутаючыся ў коўдру, паспрабавала сесці на ложку. Галя кінулася дапамагаць.

— Скажы, ты... ведала?

— Так. Рома перад вяселлем усё мне расказаў. Плакаў, прасіў прабачэння. Я была ў разгубленасці, хацела нават заяву з загса забраць. Ды прыехала Надзея Міронаўна і маліла не рабіць паспешных крокаў. Пагаварылі мы з ёю, паплакалі. Я даравала і ёй, і Раману. Толькі папрасіла мужа па магчымасці не сустракацца з дзіцем. І малі твая прасіла аб тым жа. А дачушка наша, Таццянка, відаць, адчула родную душу, пацягнулася да яе, палюбіла. Мы з Ромам вырашылі: вось паправішся, вернешся дадому, тады сустрэнемся і скажам дзяўчынкам, што яны — сёстры.

— А можа, пазней, калі падрастуць?

— Пагледзім. Галоўнае, ты зараз не хвалюйся і дарэмна не панікуй. Урачы тут добрыя, кваліфікаваныя, зробяць аперацыю і ты выздаравееш. Не сумнявайся нават. Мы яшчэ наведаемся, добра?

Галя нахілілася, асцярожна абняла Валянціну, лёгенька прыціснула да сябе, пацалавала. Развітаўшыся, яны з Раманам выйшлі з палаты.

...Валянціна, як і маці, пражыла пасля аперацыі тры гады. Пасля пахавання Раман з Галінай забралі асірацелую Наташку ў сваю сям'ю. «Я адчувала, што ты — мая сястра», — радасна абдымала яе Таццянка.

■ Сугучча

# БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ — У КАЗАХСТАНСКІМ АЛЬМАНАХУ

**Шырокімі ўяўляюцца стасункі паміж пісьменнікамі Беларусі і Казахстана. Як новы праект — знаёмства з сучаснай беларускай літаратурай на старонках штогадовага літаратурна-мастацкага альманаха «Литературная Алма-Ата».**

Поруч з такімі вядомымі ў Цэнтральнай Азіі пісьменнікамі, як Бахытжан Канап'янаў, Бахыт Кенжэеў, Нурлан Аразалін — публікацыі празаічных і паэтычных твораў беларускіх аўтараў. У казахстанскім альманаху выступаюць Юлія Алейчанка, Людміла Рублеўская, Віктар Шніп, Таццяна Сівец, Вадзім Краковіч, Алесь Бадак. Змешчаны і артыкул пра сучасны літаратурны працэс у Беларусі. Ініцыятыва прадстаўлення нашых пісьменнікаў у Казахстане гэтым разам здзейсніцца дзякуючы вядомаму літаратуразнаўцу кандыдату філалагічных навук Святлане Ананьевай. Вось што яна гаворыць з гэтай нагоды:

— Часта заязджаючы ў Беларусь, Мінск, прымаючы ўдзел штогод у Днях беларускага пісьменства ў розных рэгіёнах вашай цудоўнай краіны, я пераканалася, што сучасную беларускую літаратуру павінны ведаць чытачы іншых краін. З цікавасцю чытаю і прозу, і паэзію. Уважліва сачу за здабыткамі творчай моладзі. Мне добра знаёма тое, што пішуць і друкуюць па-беларуску і ў перакладзе на рускую мову Юлія Алейчанка, Таццяна Сівец, Маргарыта Латышкевіч, Алесь Емяльянаў-Шыловіч... Лічу, што ў вас вельмі моцныя маладыя паэты. І веру, што з часам нават у Алматы альбо Астане выйдзе нешта накшталт анталогіі «Маладая паэзія Беларусі».

Рыхтуецца новы выпуск алмацінскага літаратурна-мастацкага альманаха. І, несумненна, беларусы зноўку будуць сярод яго аўтараў.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ГНЕЎ ПРЫРОДЫ

## Самыя разбуральныя ўраганы ў гісторыі

**Магутныя ўраганы здаўна бушуюць на нашай планеце. Вельмі моцны і разбуральны у гісторы быў зафіксаваны яшчэ ў кастрычніку 1780 года. «Сан-Калікста», ці Вялікі ўраган, забраў жыцці каля 27 тысяч чалавек. Глабальныя змены тэмпературы і клімату прывялі да таго, што і ў нашы дні на Зямлі бушуюць гэтыя моцныя катаклізмы.**

Ураган — трапічны цыклон, які ўзнікае на тэрыторыі Атлантыкі, Карыбскага мора ці на ўсходзе Ціхага акіяна, пры якім вецер набывае вялікую разбуральную сілу. Само слова «ўраган» — гэта скажонае імя бога страху Хуракана ў індзейцаў паўднёваамерыканскага племя кічэ. На захадзе Ціхага акіяна ўраганы называюць «тайфунамі» (ад кітайскага «тай фунг», ці «тай фын», што азначае «вялікі вецер»), у Індыйскім акіяне і Бенгальскім заліве — «цыклонамі», каля берагоў Аўстраліі — «вілі вілі», у Акіяніі — «вілі вау», на Філіпінах — «багіа».

Шторм становіцца ўраганам, калі хуткасць ветру, які суправаджае яго, перавышае 119 кіламетраў у гадзіну. Імя прысвойваецца трапічнаму шторму, калі вецер, які суправаджае шторм, дзьме з хуткасцю больш за 62 кіламетры ў гадзіну. Трэцяя катэгорыя небяспекі прысвойваецца ўрагану, калі хуткасць ветру павышаецца да 178 кіламетраў у гадзіну. Стыхійнае бедства гэтай катэгорыі ўжо можа выклікаць разбурэнні будынкаў, паваліць дрэвы.

Самыя моцныя ўраганы звычайна бушуюць на ўзбярэжжах цёплых акіянаў і мораў. Ад іх больш за ўсё пакутуюць людзі ў Амерыцы, Мексіцы і на Кубе. Але клімат Зямлі змяняецца, і гэтыя стыхійныя бедствы цяпер не рэдкасць нават у Еўропе і Беларусі. Каб прадухіліць наступствы, сіноптыкі стараюцца загадзя прадказаць час і шляхі ўраганаў, а ўлады — прыняць патрэбныя меры для бяспекі людзей. Але часцяком усе старанні людзей бескарысныя перад неўтаймаванай моцай прыродных катаклізмаў. Вашай увазе прапануюцца самыя вядомыя разбуральныя ўраганы ў гісторыі чалавецтва.

### «Бхола»

Бедства нябачанага маштабу абрынулася на Усходні Пакістан і Заходнюю Бенгалію (штат на ўсходзе Індыі) 12 лістапада 1970 года. Нягледзячы на тое што ўраган дасягнуў толькі трэцяй катэгорыі па шкале ўраганаў Сафіра-Сімпсана, ён стаў адным з самых пагібельных у гісторыі чалавецтва. Цыклон «Бхола» сфарміраваўся над Бенгальскім



залівам яшчэ 8 лістапада, а потым стаў перамяшчацца на поўнач, адначасна набіраючы хуткасць. У момант яе піка ён дасягнуў берагавой лініі Усходняга Пакістана. Некаторыя населеныя пункты папросту сцерла ў парашок. Удар штармавога прыліву забраў жыцці мінімум 224 000 чалавек.

Ураган стаў сапраўды лёсавызначальным, паколькі змяніў карту дзяржаў. Рэзкая крытыка ўладаў за марудлівасць пры ліквідацыі наступстваў цыклона прывяла да таго, што на выбарах, якія адбыліся ў снежні таго ж года, перамагла ўсходнепакістанская апазіцыя. Працяглае супрацьстаянне, якое настала за гэтым, вылілася ў вайну. У выніку ўтварылася дзяржава Бангладэш.

### «Сан-Калікста»

Ураган «Сан-Калікста», або Вялікі ўраган 1780 года, лічыцца самым смяротным штормам за ўсю гісторыю назіранняў Паўночнаатлантычнага басейна. Ён бушаваў з 9 да 20 кастрычніка і быў вельмі разбуральны. Хуткасць ветру ў момант абрушэння на Барбадас верагодна перавышала 320 км/г.



Паводле сведчанняў відавочцаў таго часу, вецер быў «такі аглушальны, што людзі не чулі свайго голасу», а з дрэў, перад тым як іх паваліць, ён здзіраў кару. Нават цяжкія гарматы былі ссунутыя на адлегласць каля 30 метраў. Што ўжо казаць пра людзей — толькі на востраве Барбадас Вялікі ўраган забраў жыцці 4500 чалавек. Каля вострава Грэнада разбіліся 19 галандскіх караблёў, а ў Сент-Лусіі разнесла на трэскі флот брытанскага адмірала Джорджа Родні. Адзін з караблёў эскадры падняло і літаральна выкінула на будынак гарадской бальніцы, якая была непадалёк. Усяго «Сан-Калікста» загубіў каля 27 500 чалавек.

### «Катрына»

Адзін з самых вядомых у свеце і самы разбуральны за ўсю гісторыю ЗША. Фарміраванне «Катрыны» пачалося ў вобласці Багамскіх астравоў 23 жніўня 2005 года. Яшчэ да таго, як ён дасягнуў узбярэжжа Злучаных Штатаў, яму быў прысвоены пяты (апошні) узровень небяспекі па шкале Сафіра-Сімпсана. Праўда, за 12 гадзін да таго, як абрынуцца на ЗША, ураган усё ж аслабеў да чацвёртай катэгорыі. І ўсё роўна хуткасць ветру «Катрыны» дасягала 280 км/г. 27 жніўня ўраган дасягнуў узбярэжжа Фларыды, а затым павярнуў у бок Мексіканскага заліва. Штаты Луізіяна, Алабама, Фларыда і Місісіпі былі абвешчаныя зонай стыхійнага бедства, пачалася масавая эвакуацыя.



Затоплены пасля «Катрыны» Новы Арлеан.

Новы Арлеан і яго наваколлі пакінула больш за мільён чалавек (каля 80 % усяго насельніцтва). Перад крамамі і аўтазапраўкамі выстраіліся кіламетровыя чэргі. Але пакінуць горад змаглі не ўсе — каля 150 000 гараджан, якія пражывалі за мяжой беднасці, не мелі магчымасці з'ехаць. Грамадскі транспарт спыніў работу, таму тым, у каго не было машыны, заставалася толькі схавацца ў крытым стадыёне пад назвай «Супердоўм», як параілі зрабіць гарадскія ўлады. 29 жніўня 2005 года ўраган дасягнуў Луізіяны і Місісіпі. Дамбы Новага Арлеана, 70 % тэрыторыі якога знаходзіцца ніжэй за ўзровень мора, былі пашкоджаныя, пачалося затапленне горада. Дах «Супердоўма» моцна пашкодзіў вецер. «Катрына» забрала жыцці 1836 чалавек (з іх — звыш 720 у Новым Арлеане), эканамічны ўрон склаў каля $125 млрд.

### «Ніна»

Гэта нават не тайфун, а супертайфун, які пранёсся над Кітаем і Тайванем у пачатку жніўня 1975 года. Ураган, хуткасць ветру якога дасягала 250 км/г, выклікаў моцную паводку, разбурыў найбуйнейшую ў кітайскай правінцыі Хэнань дамбу Баньцяа (прычым яна была сканструяваная такім чынам, каб перажыць паводкі, якія здараюцца не часцей за адзін раз у 1000 гадоў) і яшчэ 62 больш дробныя плаціны, сцёр з твару зямлі без малога 6 млн будынкаў.



За ўвесь час катастрофы ўцечка вады склала 15,7 млрд м$^3$. Паводка выклікала хвалю вышынёй ад 3 да 7 м і шырынёй 10 км.

Ураган «Ніна» забраў жыцці 26 000 чалавек (гэта толькі тыя, хто патануў) і стаў адным з самых разбуральных у гісторыі. Але гэтых ахвяр яму аказалася мала: больш за 145 000 людзей памерла пазней — ад голаду (загінулі пасевы і звыш 300 000 галоў жывёлы). Поўная колькасць ахвяр, па розных ацэнках, склала ад 171 000 да 230 000 чалавек, шкода ад урагану ацэньваецца ў $1,2 млрд.

### «Айк»

Гэтаму ўрагану, які бушаваў у пачатку верасня 2008 года, была прысвоена чацвёртая катэгорыя небяспекі. Праўда, калі «Айк» 13 чысла дабраўся да паўднёвых раёнаў Тэхаса, ён аслабеў да другой катэгорыі, хуткасць ветру складала «ўсяго» 135 км/г.



Тым не менш «Айк» змог разбурыць няўдачлівы гарадок Галвестан (у 1900 годзе тут таксама прайшоўся ўраган). Ад урагану загінула 195 чалавек. Аднак у гісторыю ён увайшоў як самы вялікі па памеры трапічны цыклон у Атлантыцы за ўсю гісторыю назіранняў — дыяметр шторму, па розных звестках, склаў ад 900 да 1450 км.

Акрамя гэтых глабальных стыхійных бедстваў вялікія разбуральныя наступствы пакінулі ў гісторыі і некаторыя іншыя прыродныя катаклізмы.

У 1900 годзе ў штаце Тэхас бушаваў ураган «Галвестан». Вецер дзьмуў з хуткасцю 215 км/г (4 катэгорыі). Гэта самае смяротнае бедства ў ЗША забрала жыцці 6000 людзей і разбурыла 3600 дамоў.

У жніўні 1969 года ўраган «Каміла» прайшоўся па Кубе і Мексіканскім заліве. Хуткасць ветру дасягала 310 км/г, вышыня хваляў — 7,3 м. Ён прывёў да паводкі і гібелі 259 чалавек. «Каміла» разбурыла ўсе будынкі ў вусці ракі Місісіпі і прынесла шкоду каля $9,14 млрд.

Ураган «Мітч» прайшоўся ў 1998 годзе па тэрыторыях Гандураса, Сальвадора і Нікарагуа. Хуткасць ветру дасягала 280 км/г. Загінула 11 тысяч чалавек, без прытулку засталіся 3 млн.

Супертайфун «Яланда» пранёсся над тэрыторыяй В'етнама і Філіпін у 2013 годзе, хуткасць ветру дасягала 389 км/г. Стыхія забіла 8 тысяч чалавек, 11 млн засталіся без жылля.

■ Тэхналогіі

## Штучны інтэлект будзе вылічаць крамных злодзеяў

**У наш час адкрываецца ўсё больш магазінаў, дзе тавары не трэба аплачваць на касе, усё пабудавана на самаабслугоўванні і ў гандлёвай зале няма прадаўцоў. Аднак гэта можа прыцягнуць у такія месцы зладзюжак. Вядома, ніхто не адмяняў сістэму відэаназірання, але яе вырашылі значна палепшыць, навучыўшы штучны інтэлект вылічаць злачынца да таго, як той зробіць крадзеж.**

За распрацоўку вельмі цікавага праграмнага забеспячэння адказвае кампанія Standard Cognition. У сістэме на гэты момант выкарыстоўваецца 27 камер, якія кіруюцца асаблівым алгарытмам. Ён рэгіструе практычна ўсе паказчыкі пакупнікоў: хуткасць і даўжыню крокаў, напрамак погляду і нават той тавар, на які глядзіць пакупнік у пэўны



момант. Праграма вылічае, як доўга чалавек разглядае этыкеткі, сочыць за перамяшчэннем тавараў па гандлёвай зале і гэтак далей. Але самае галоўнае, з усёй атрыманай інфармацыі праграма робіць высноў пра «патэнцыйную нядобранадзейнасць» пакупніка.

Пяцёра з сямі заснавальнікаў Standard Cognition раней працавалі ў Камісіі па каштоўных паперах і біржах ЗША, дзе распрацоўвалі алгарытмы для выяўлення ашуканскіх схем, таму патрэбны досвед у кампаніі маецца. Як заявіў адзін з кіраўнікоў Standard Cognition Майкл Сусвэл, «на самай справе, усё даволі проста: у патэнцыйных зладзюжак больш шырокі крок, яны ўвесь час шукаюць вачыма выхад, і гэта толькі пара прыкладаў у паводзінах, якія паказваюць на нядобрасумленнасць. Калі сістэма западозрыць кагосьці ў спробе крадзяжу, яна паведаміць пра гэта ахоўніку крамы і той накіруецца да чалавека для высвятлення сітуацыі».

Кампанія ўжо атрымала інвестыцыі ў памеры 11,2 мільёна долараў ЗША і адкрыла першы тэставы магазін, дзе будуць выяўляцца недахопы сістэмы і праводзіцца яе дапрацоўка. Да 2020 года ў планы кампаніі ўваходзіць абсталёўваць сваёй сістэмай не менш за 100 крам кожны дзень.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.





# СІНІЦА Ў РУКАХ...

На хутары Сасновы Бор у сярэдзіне верасня працягваецца незвычайнае «жніво» — птушынае. Калі прырода пачынае сыходзіць на свой адпачынак, дык у арнітолагаў усё наадварот — у іх якраз самы актыўны перыяд. Менавіта ў гэты час у нашых крылатых братоў пачынаецца восеньская міграцыя. Абарыгенныя віды пакідаюць месцы гнездавання, падаюцца ў няблізкі вырай, а праз нашу тэрыторыю з Поўначы качуюць незлічоныя стаі маленькіх і вялікіх птушак. Для некаторых з іх Беларусь становіцца таксама выраем. Каб разабрацца ў гэтых складаных міграцыйных маршрутах, была пабудавана невялікая лясная станцыя кальцавання птушак каля аграсядзібы «Заімка лесуна». Гэткай ініцыятывай гаспадар сядзібы Дзмітрый ШАМОВІЧ і арнітолаг Дзяніс КІЦЕЛЬ вырашылі дапамагаць Цэнтру кальцавання пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 2014 года на станцыі было ўлічана больш за дваццаць тысяч крылатых. Адных толькі відаў — больш за сотню. Сярод звычайных аўсянак, заранак, сініц, пеначак, чачотак, валавок і іншых відаў і падвідаў трапляюцца і зусім рэдкія экзэмпляры. У тым жа 2014 годзе была злоўлена і акальцавана пеначка-зарнічка — сапраўднае адкрыццё для айчыннай заалагічнай навукі. А зрабіў навуковы «сюрпрыз» менавіта Дзяніс Кіцель.

На гэтых фотаздымках Дзянісу дапамагае мінскі біёлаг Вольга ІЛЫНА. Каля сядзібы заўсёды нацягнутыя адмысловыя сеткі-пасткі. Кожную гадзіну арнітолагі абыходзяць гэтыя паветраныя невады і дастаюць свой крылаты «ўлоў», кладуць яго ў паркалёвыя торбачкі і адпраўляюцца кальцаваць.

— Часам за дзень трапляе ў сеткі да дзвюх сотняў і больш птушак, бывае — зусім мала: раз на раз не выходзіць, — кажа птушкалоў. — Кожную птушку мы маркіруем адмысловым кальцом, заносім параметры птушынай асобіны ў архіўны журнал і хутка выпускаем на волю.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*Расонскі раён.*







*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*



## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка | **Кадастровый номер** 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Героев обороны Брестской крепости, 18 | 1030733 | 0,0971 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дама | **41 976,33** | 8 395,00 | **4 359,69** | 0,0036 га – охранная зона линий связи и радиофикации |
| 2 | ул. Героев обороны Брестской крепости, 24 | 1030732 | 0,1467 | | **63 418,41** | 12 683,00 | **4 169,49** | 0,0063 га – охранная зона линий связи и радиофикации; 0,0054 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод низкого давления) |
| 3 | ул. Старозадворская, 22/1 | 1030668 | 0,1415 | | **34 936,35** | 6 980,00 | **2 074,84** | ограничений в использовании земель нет |

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 — **2 450,00 рублей**

**Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с №BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка AKBBBY21100, УНП 290433924**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

